ЛІТАРАТУРА і мастацтва

24 чэрвеня 2005 г. № 25/4312

АНОНС!

Той, хто мае вочы і хоча бачыць, бачыць: «мірная» агрэсія супраць той ці іншай дзяржавы дзеля перамогі «дэмакратыі» ў тым ці іншым рэгіёне свету пачыналася, і дагэтуль пачынаецца, не з прэтэнзій на чужыя тэрыторыі і базавыя эканомікі (хоць мэта якраз гэта), а з пранікнення ў сферы інфармацыі, адукацыі і культуры, якія ўплываюць на чалавека і яго духоўную арыентацыю, мяняючы часта не толькі гэту самую арыентацыю, але ўвесь спектр выпрацаваных народам (народамі свету!) на працягу ўсёй гісторыі каштоўнасцей.

СТАР. 2-3

Нашы класікі ўмелі шанаваць простыя радасці *пісьменніцкага* жыцця, прычым публічна, г.зн. ва ўласных жа творах: менш чым сто год таму выхад паэтычнага зборніка мог пераважыць для шчаслівага аўтара шматвяковы цяжар самоты, што дасталася яму ў спадчыну. Сёння ж ці не кожная новая кніга паэзіі памянёную самоту не проста памнажае: здаецца, паэты вырашылі ахвяраваць вольным часам і асабістым жыццём, каб вынайсці як мага больш яе відаў, форм і гатункаў.

СТАР. 6

Абаяльная і мудрая



"Да гэтага я ніколі не бачыў яе і быў уражаны вялікай духоўнай энергіяй пісьменніцы. Гаварыла яна вольна, часам са змястоўным гумарам, не ўзвышаючы сябе ні творамі, ні гадамі. У гутарцы мы былі роўнымі. Я ўбачыў у ёй не толькі абаяльную жанчыну, але і мудрага чалавека", — так напісаў Віктар Хурсік пра Лідзію АРАБЕЙ у прадмове да новай кнігі пісьменніцы "Пошукі ісціны".

Вядомы празаік, крытык, літаратуразнаўца, аўтар шматлікіх зборнікаў аповесцей і апавяданняў, сярод якіх — "Мера часу", "Экзамен", "Ваўчкі", "Сярод ночы", "Паласа дажджу", "Пошукі кахання", "Калібры", раманаў "Іскры ў папялішчы" і "Сузор'е Вялікай Мядзведзіцы", Лідзія АРАБЕЙ адзначае сваё 80-годдзе.

Шчыра віншуем Лідзію Львоўну з юбілеем, паспяховымі "Пошукамі ісціны" і чакаем новых твораў.

Фота Віктара КАВАЛЁВА

СТАР. 16

Айчына... Айцом Нябесным дадзеная продкам нашым, нам і нашым нашчадкам зямля... Шмат яна бачыла ў межах тысячагадовай гісторыі — мільёны жыццяў забірала, мільёнамі жыццяў з веку ў век адраджалася, у розныя княствы, каралеўствы і імперыі ўваходзячы, рознымі імёнамі называючыся. А ўсё гэтак жа, як запаведаваў Гасподзь, умывалася дажджамі, укрывалася снягамі, адагравалася вясновым сонейкам, гукала ратаяў у поле, каб зноў і зноў красавалі нівы і зерне налівалася зямною сілаю, — люду на карысць, нам, дзецям яе, на радасць. Як жа не схіляцца перад ёю ва ўдзячным паклоне? Як не любіць яе — штодня, з дня ў дзень не аддаваць ёй сваю любоў, сваю працу, свой клопат?

ДЗЕЛЯ Айчыны сваёй

Праз прадзедаў дзядам гэта замаўлялася, дзяды, чарговы раз край свой ад ворагаў засланіўшы, бацькам нашым перадавалі, бацькі спрабуюць нам перадаць, мы... Мы, як часам здаецца, яшчэ не ўсвядомілі меру сваёй адказнасці за тых, хто прадоўжыць гісторыю роду нашага, хто ўзвысіць новай славаю Айчыну — Беларусь. Яны — моладзь, дзятва! — побач з намі. Прыглядваюцца да спраў здзяйсняемых. Прыслухоўваюцца да слоў моўленых. Прымерваюцца да новых дзён, азораных дзяржаўнай незалежнасцю. Што ўгледзяць, каго пачуюць, які са штандараў незалежнасці панясуць далей, — шмат ад чаго залежыць у сённяшнім расхрыстаным, адкрытым для ўсіх інфармацыйных і ідэалагічных павеваў свеце. Шмат ад чаго, і, найперш, ад нас — ад нашае любові да іх.

Так, так, ад любові! — я не абмовілася. Ад шчырай і пазбаўленай эгаізму любові — без вечна незадаволенага: «ды мы ў іх гады...» ці, таго горш: «няхай хоць яны, дзеці нашы, пажывуць...» І ў першым, і ў другім выпадку, часта падсвядома, абзываецца эгаізм, эгаістычнае пачуццё ўласнае перавагі: як жа! мы тысячы перашкодаў адольвалі і адолелі, каб вывучыцца, выйсці ў людзі, а яны... А ім — не пабаюся гэта сцвярджаць! — мы, падштурхоўваючы, выштурхваючы іх у гэтыя самыя «людзі», перашкаджаем. Бо, як вядома, толькі нялёгкая праца, фізічная і духоўная, толькі пераадольванне цяжкасцей і пакутны пошук свайго месца ў жыцці робяць чалавека чалавекам. Чалавекам і — грамадзянінам.

Ды вось жа і вядома, а ўзгадваецца рэдка. Мо таму, што прасцей — і спакайней! — адкупіцца ад праблемы дзіцяці цацкаю, цукеркамі, камп'ютэрам (быццам не ўзнікнуць у яго потым іншыя — большыя!), адмахнуцца ад яго пытанняў, задумацца над якімі не выпадае — не стае, як даўно здаецца, ні сілы, ні часу. Але і праблемы нікуды не знікаюць — проста выносяцца з дому на вуліцу, і на пытанні — не дома, не ў гурце аднагодкаў, дык у цытатніку якога заезджага фокусніка-палітыкана — адказы знаходзяцца. І да чаго гэтыя «адказы» могуць падштурхнуць маладую, незагартаваную душу, аднаму Богу вядома. Хоць, калі, па кадрах тэлехронікі, аднавіць у памяці твары «юнцоў» на вуліцах сталіц Грузіі, Украіны, Кіргізіі падчас розных высаджаных там дарослымі дзядзькамі «каляровых рэвалюцый», то ўявіць няцяжка. Сякія-такія праявы маладой бяздумнай злосці, падагрэтай не так улёткамі, як бляшанкамі замежнага піва, і ў нашай сталіцы тэлекамерамі неаднойчы фіксаваліся, а потым шчодра тыражыраваліся па ўсім свеце...

Не ведаю, як пачувалі сябе бацькі сабраных пад чужымі сцягамі дзяцей, ці бачылі сваю віну ў тым, што сабрала іх не любоў да дома свайго, не любоў да зямлі родавай, спадчыннай, а чарговым пакрыўджаным «правадыром» збуджаная прага ламаць і крышыць не імі, а для іх, няўдзячных, збудаванае. Мне было прыкра. Прыкра і балюча. Маладыя ж з вераю да звернутых да іх гераічных заклікаў ідуць на розныя мітынгі і шэсці — іх жа абараніць волю і дэмакратыю заклікаюць! Не заробак, выплачваемы «зялёнымі» і права на замежныя паездкі таго ці іншага з пасівелых у барацьбе супраць свайго народа апазіцыйных дзялкоў (як на самай справе!), а — воля і дэмакратыю! Якое маладое сэрца не адгукнецца на такі заклік у натоўпе аматараў піва ці ў студэнцкай кампаніі?

Так, магчыма, нам хвалявацца асабліва няма чаго: спакойная разважлівасць, гаспадарлівасць у адносінах да ўласнага жыцця і навакольнага свету, уменне выявіць свае здольнасці і скарыстаць іх для справы — генетычна ў беларусу закладзеныя. Але свет развіваецца так імкліва, змены адбываюцца такія кардынальныя, што ўжо адкрыта абмяркоўваецца (і прапаноўваецца ўвесці ва ўжытак), на жаль, не толькі ў асяроддзі вучоных, як мажлівасць масавага псіхічнага ўздзеяння на людзей, так і дзейснасць генной інжынерыі, якая можа быць скарыстана (як вядома, многія адкрыцці і распрацоўкі вучоных служылі і служаць злу) — не адно на аздараўленне чалавечага арганізма. Ад прагрэсу (слова можна ўзяць у двукоссе), як паказвае практыка, не схавацца, і калі — чарвяточынка за чарвяточынкаю — падточваецца імунная абарона маладых, не загартаваных своечасова бацькамі арганізмаў, страты могуць аказацца незваротнымі.

Той, хто мае вочы і хоча бачыць, бачыць: «мірная» агрэсія супраць той ці іншай дзяржавы дзеля перамогі «дэмакратыі» ў тым ці іншым рэгіёне свету пачыналася, і дагэтуль пачынаецца, не з прэтэнзій на чужыя тэрыторыі і базавыя эканомікі (хоць мэта якраз гэта), а з пранікнення ў сферы інфармацыі, адукацыі і культуры, якія ўплываюць на чалавека і яго духоўную арыентацыю, мяняючы часта не толькі гэту самую арыентацыю, але ўвесь спектр выпрацаваных народам (народамі свету!) на працягу ўсёй гісторыі каштоўнасцей.

На гэта — адпускаюцца прэтэндэнтамі на сусветную ўладу аграмадныя сродкі, на рэалізацыю задуманага ў выпадку падобнай агрэсіі працуе аграмадная армія добра навучаных імі малойцаў — палітолагаў, паліттэхнолагаў, журналістаў-спецназаўцаў, якія, калі патрабуецца, зграяй груганоў накідваюцца на вызначаную іх гаспадарамі ахвяру. Колькі падобных фактаў можа ўзнавіць памяць, колькі падобных «карцінак» мільгае ледзь не штодня на тэлеэкранах, а мы ўсё ўглядваемся ў твары (часта — адны і тыя ж), усё спрабуем даўмецца, як лепш да гэтага паставіцца. З падазронасцю ці з цікавасцю? Актыўна ці абыякава?

Ні ў якім разе не абыякава! Усе рэвалюцыі, усе войны пачыналіся не таму, што з'яўлялася купка зацятых рэвалюцыянераў ці групоўка пыхлівых вайскоўцаў, патэнцыяльных (у іх уласных вачах) маршалаў, а таму, што людзі ў масе сваёй хацелі (і верылі, што гэта магчыма) жыць адно ўласнымі клопатамі і заплюшчваліся, а то і адварочваліся ад усё большай, усё больш яўнай небяспекі, застаючыся абыякавымі, а то і проста дэманструючы н я ў д з е л у палітыцы, у жыцці грамадства: маўляў, мая хата з краю...

Заставацца з краю ніколі нікому не ўдавалася... І пра гэта варта памятаць усім бяспамятным. Бо ўстойлівасць дзяржавы, спакойная плынь жыцця яе грамадзян залежаць не ад няўдзелу, а ад самага актыўнага ў д з е л у ў справах на агульную — агульнанародную, як бы пафасна гэта ні гучала, — карысць: толькі тады народ і ў радасці і ў горы жыве як адна сям'я, толькі тады з'яўляецца дзейснае спадзяванне на будучыню — на светлы заможны дом, што ўзводзіцца ўсімі разам, усёй грамадою.

Для чаго, запытацца, так настойліва, на працягу вякоў, унушаецца: чалавек — індывідуаліст па самой сваёй прыродзе? Пэўна ж, не для таго, каб «індывідуаліст» неяк у вольную хвіліну задумаўся над пытаннем: што ён зрабіў, што мог бы зрабіць — адзін? без сям'і? без сяброў і паплечнікаў? без апоры на род свой — на народ? Не для таго. Але новае слова — новая нажыўка! Заглыне хто гэтую нажыўку — наступная ўжо чакае непадалёку: выжывае дужэйшы... чалавек чалавеку воўк... І тое, што зноў і зноў — каторы ўжо раз! — людству падкідваецца д'яблава ўстаноўка на перараджэнне, на азвярэнне, ужо не ўзгадваецца. А павінна — павінна! — узгадвацца. Усімі і паўсюдна. Інакш наперадзе — сапраўды азвярэнне, з праявамі якога мы ўжо не-не і сутыкаемся, калі маці забівае толькі што народжанае ёю немаўля, калі п'яны бацькі чыніць гвалт над малой дачкою, калі сын забівае бацькоў, і ўсё — з-за прагі да амаральных уцехаў, гарэлкі, грошай, а то і проста пад настрой...

Балюча — пра гэта, пра гэткае. Балюча і страшна. І вінаватых жа, апроч нас саміх, няма. І ківаць на час, на бяздзейнасць уладаў марна. Варта спыніцца на некалькі хвілін там, дзе заспее трывога, не проста азірнуцца вакол, а пільна (сэрцам!) угледзецца ў тых, хто апынуўся паблізу (на вуліцы, ва ўстанове, у вагоне метро, у царкве), — і трывога пачне расці. Змушаць задумацца.

Хлапчаня, якога вывелі з «Макдональдса», спыняецца перад вітрынаю з дзіцячымі кніжкамі, просіць купіць яму самую яркую з іх, а маці, зіркнуўшы на цану (а кніга яшчэ ж і на роднай мове!), цягне малога далей. Выходзіць: патрацілася на шкодны для яго здароўя «бігмак», не задумваючыся, а на кнігу, неабходную для ўмацавання духоўнага здароўя дзіцяці на ўсе гады наперадзе, меншых грошай пашкадавала?!

Падшыванцы, разваліўшыся на лаўцы ў скверыку, смокчуць піва з пляшак і кідаюць іх разам з брыдкімі словамі бяздумнай, нічым, апроч дурной звычкі, не запатрабаванай лаянкі, на траву, на алею... Яны што — усе бязбацькавічы і ніколі не вучыліся ў школе?!

Старая бабулька, атрымаўшы пенсію, выходзіць з паштовага аддзялення і «натыкаецца» на маладога дэбіла (як яшчэ яго назваць?), які выдзірае ў яе грошы і знікае, — і каб хоць на міг варухнулася думка пра тое, што старой давядзецца цэлы месяц жыць упрогаладзь... Дзе ён рос і дзе завершыць жыццёвы шлях, як ужо цяпер ні кроплі людскога спачування няма ў пустым сэрцы?!

Шыкоўнае аўто, за рулём якога — модна апрануты, задаволены сабою «адмарозак», імчыць па праспекце, перавышаючы дапушчальную ў горадзе хуткасць, не запыняючыся на знакі светлафораў, не абмінаючы на пешаходным пераходзе школьніка... Адкуль у гэтага маладога нягодніка і не па даходах шыкоўная машына, і ўсёпаглынальнае пачуццё усёдазволенасці?!

Простыя вулічныя замалёўкі... Што вымалявалася б, калі зазірнуць у начныя бары, сауны, ці Божа збаў, стаць сведкам крымінальнай разборкі ці жахлівага крывавага злачынства, і ўяўляць не хачу (вялікае мноства такіх сведчанняў бессаромна дэманструюць бясконцыя спецперадачы і тэлесерыялы!). Адно скажу: прычына т а к і х паводзінаў, т а к і х адносін да сабе падобных — да чалавека! — ва ўсіх выпадках адна і тая ж. Амаральнасць. Поўная адсутнасць маральных установак і — абумоўленая гэтым — цынічная пагарда да тысячагоддзямі выпрацаваных чалавецтвам правілаў і табу.

Выпрацаваных для таго, каб выбавіцца ад звера, ад звярынага ў сабе, паступова, крок за крокам, набліжаючыся да сябе-чалавека — істоты духоўнай і адно тым адрознай ад жывёльнага свету, і адно тым патрэбнай свету, Сусвету, Космасу. Што ж мы — рушылі ў адваротны шлях?! Назад — у дзікунства?!

Хтосьці, напэўна, успрыме мае словы ў штыкі. Тут, маўляў, абы дзень да вечара... Тут ні на што, маўляў, грошай не хапае, а пісьменніца той факт, што нехта дзіцяці кніжку не купіў, у глабальную праблему ператварае... Але не дай Бог нам дажыць да тых дзён, калі гэта глабальная праблема, паўстаўшы на ўвесь рост, паглыне ўсе людскія памкненні, пакуты, адкрыцці, дасягненні і здабыткі! — не будзе чым бараніцца і абараніцца. Ні ў глабальным маштабе, ні ў асабістым.

І пра дзіцячую кнігу — пра кнігу! — я не без дай прычыны загаварыла. Можна ўзгадаць агульнавядомае, запаведанае: «Спачатку было Слова...», можна спаслацца на вызначаную і вытлумачаную навукаю залежнасць мыслення ад слова — глыбіні мыслення ад багацця слоўнага запасу. Можна параіць паназіраць за сабою, за сваёй практыкаю карыстання словам. Выснова, хочаш тое прызнаваць ці не, адна: простае назапашванне той ці іншай інфармацыі, да якога, на вялікі жаль, усё ў большай ступені зводзяцца, цяпер ужо і ў нас, патрабаванні да вучняў, студэнтаў, а потым і да спецыялістаў, духоўнага багажу не дадае: чалавек прайграе і прайграе камп'ютэру. І ў хуткасці, і ў якасці аналізу. І не толькі таму, што, як сцвярджаюць вучоныя, дасюль толькі малюпасенькая частачка чалавечага мозгу задзейнічана і працуе, а таму, што задача чалавека — і н ш а я, што яму запаве-

даны іншы — д у х о ў н ы ! — шлях. І апірышчам на гэтым шляху — толькі слова, толькі кніга — як с л о в а, удыхнутае Госпадам і матэрыялізаванае чалавекам. Пісьменнікам. Журналістам. Вучоным. Настаўнікам.

Як, з якою мераю адказнасці, з якою мераю таленту матэрыялізаванае, пытанне асобнае. Важней, мяркую, тое, ці ідзе слова ад сэрца, ці ўзбагачае свет — нас у гэтым свеце, ці знаходзіць водгук у нечыіх развагах, словах, учынках.

Узгаданыя, або неўзгаданыя, учынкі маладых, якія сведчаць пра пагражальна хуткае распаўсюджванне вірусу бездухоўнасці і захворванне ўжо ўсяго грамадства, пацвярджаюць тое, што падстава для падобнай гаворкі больш чым сур'ёзная. І радуе, што, няхай нячаста і не на ўвесь голас, але пачынае гучаць трывога за будучыню ў зваротах і артыкулах настаўнікаў: нельга выцясняць са школьных праграм літаратуру, а сучасныя творы і творцаў не заўважаць, нельга выкладаць літаратуру па тых падручніках, якія складзены літаратуразнаўцамі для літаратуразнаўцаў (даты жыцця і смерці, тэмы і героі, зноў даты і біяграфічныя даведкі!) і весці ўрокі так, быццам у літаратурных творах гаворка ідзе не пра сэнс духоўнага быцця чалавека і чалавецтва, а пра чужых па часе і месцы дзеяння, нерэальных героях.

Добра пра гэта сказаў (СБ, 16.06.2005 г.) дацэнт Брэсцкага дзяржуніверсітэта Ю. Паталкоў: «Калі літаратура будзе ўспрымацца намі як голас месіі, што жыве сярод нас, вучні пачнуць чытаць кнігі, прычым арыгінальныя, а не «глянцавыя» бестселеры. Справа настаўніка... не фарміраваць душы навучэнцаў, а разам з вучнямі фарміравацца, спасцігаючы глыбіні вобразаў». Я дадала б: спасцігаючы няспешна, каб душа паспявала адгукацца — згодаю ці нязгодаю, замілаваннем ці сумненнем, каб навучылася прымаць гэту няпростую духоўную працу з радасцю.

Максімалісцкае запатрабаванне? Мажліва. Але варта пагартаць падручнікі па беларускай мове, літаратуры, прыродазнаўстве і гісторыі Беларусі (не кажу ўжо пра розныя даведнікі і дапаможнікі!), і становіцца відочна, што яны з самага пачатку не запраграмаваныя на тое, каб збудзіць у школьніку любоў да роднага слова, да роднай зямлі, зацікавіць яго пошукам ісціны, які не спыняецца на гэтай зямлі ўжо добрае тысячагоддзе, змусіць задумацца, пашукаць у перапляценні розных часоў выток свайго роду. Гэткія датнікі-цытатнікі! Хоць, як вядома, амаль усе даты, лічбы і назвы пасля экзаменаў тут жа выветрываюцца з любой галавы, і толькі той, хто абярэ прафесію вучонага-літаратуразнаўцы, нейкім чынам скарыстае завучанае.

А сёння ж — яшчэ адна дурная навала! «Рупліўцы за адраджэнне родной мовы» намерыліся ўшчэнт яе разбурыць — у настальгічным прыпадку любові да дваццатых гадоў мінулага стагоддзя (а не маюць жа да іх ніякага дачынення!) размываюць правапіс, які выпрацаваны і даўно зацвердзіўся ў літаратурнай мове, засмечваюць творы паланізмамі. І ўсё толькі з адною мэтаю: апазіцыйна настроеная інтэлігенцыя (за якія дывідэнды, не з'яўляецца тэмаю сённяшняй гаворкі) хоча мець с в а ю мову, адрозную ад той, якая складвалася і склалася (дарэчы, з іх жа дапамогаю!) у савецкія гады. І ніхто не скажа: аксціцеся, спадары «інтэлігенты»! Зазірніце ў свае тамы прозы і паэзіі, разгарніце вамі некалі напісаныя падручнікі і абароненыя дысертацыі, раскладзіце перад сабою ўзнагароды, выгандляваныя за іх у часы савецкай улады, — калі вы былі пераараджэнцамі? Тады? Сёння? І якое права маеце гаварыць за ўсю інтэлігенцыю, якая і тады працавала, і сёння працуе не дзеля ўзнагародаў, а дзеля Айчыны сваёй?

Мо і не варта было б зноў агучваць гэтыя пытанні, але ж гаворка не пра гульню «філёлагаў» у «клясы» і «глёбусы» — на ўжыванні падобнага правапісу ўсё больш рашуча настойвае апазіцыя. І не проста настойвае: выходзіць у свет часопіс Саюза пісьменнікаў (пісьменнікі, апроч купкі зацятых «філёлагаў», не маюць да яго выдання ніякага дачынення), выдаюцца кнігі, улёткі, а іх аўтары раз'язджаюць з імі па ўсіх рэгіёнах рэспублікі, прапагандуюць у школах...

Іздзіўляе — нягледзячы на ўсё гэта! — поўнае заспакаенне ў чыноўніцкіх радах, абыякавая няўвага не толькі настаўніцтва, але і ўсяго грамадства!

Дзіўна, што Беларусь нехта там на захадзе абвінавачвае ў адсутнасці дэмакратыі і парушэнні правоў чалавека: ды куды ўжо больш правоў?! Купка безадказных перад гісторыяй народа людзей прагне павярнуць эвалюцыю назад, пачаць працэс фарміравання свядомасці народа і рэформу мовы спачатку і робіць для гэтага далёка не бяскрыўдныя захады, а ні Міністэрства адукацыі, ні Нацыянальная акадэмія навук, у якой працуюць два навуковыя інстытуты — Інстытут мовы і Інстытут літаратуры, не тое што ніяк не ўплываюць на развіццё падзей, а нават ацэнку ім не могуць выпрацаваць. Дзе такое магчыма? Пакажыце такую краіну ў свеце, у якой дазволена глуміцца над моваю — над м о в а ю н а р о д а ! — адвольна мяняючы законы, па якіх яна з веку ў век развіваецца, а ў нас тыя, хто глуміцца над ёю, яшчэ і ў «адраджэнцах» ходзяць...

Прадбачу пярэчанні, накшталт: «мы вяртаем тое, што бальшавікі зламалі праз калена», і наперад хачу спытаць спадарства, ч ы м яны — ад бальшавікоў адрозніваюцца, калі зноў імкнуцца ламануць праз калена, ігнаруючы пройдзены народам шлях, у духоўнай слепаце сваёй ігнаруючы законы эвалюцыі, э в а л ю ц ы й н а г а развіцця гісторыі?

Зірнуць — бунтоўныя розумы ў любой краіне свету падштурхваюць і грамадскую думку, і ўрадавыя структуры да больш хуткага пераадолення часавага, гістарычнага прамежку паміж сённяшнім днём і наступным, а на Беларусі — нашы вечна пакрыўджаныя адно імкнуцца пераканаць усіх у неабходнасці вярнуцца ледзь не на стагоддзе назад (чаму, запытацца, адразу не ў XVI ст. ці нават у X ст., калі не было ўплыву Расіі?). І не, каб уразумець нарэшце, што Беларусі патрэбны не «апазіцыянеры», якія варагуюць з гісторыяй, нават не апантаныя ўлюбёнцы ў гэту гісторыю (да якіх і я належу), а рупліўцы на ніве адукацыі і культуры, якія ведаюць: каб сабраць ураджай, трэба адабраць лепшыя зярняты, высеяць іх у падрыхтаваную глебу, потым даглядаць парасткі, працаю і малітваю абараняючы ад розных паразітаў. Былі б мы ўсе — навукоўцы, пісьменнікі, журналісты, настаўнікі, чыноўны люд — такімі рупліўцамі, шмат што змянілася б і ў культуры, і ў літаратуры, і ў школе. А значыцца — і ў агульнанародным жыцці.

Дык жа не... Зірнеш на ўсё, што сёння здзяйсняецца народам — сэрца радуецца: гарады і вёскі прыгажэюць, адбудоўваюцца, дарогі пракладваюцца, прадукцыя прадпрыемстваў становіцца ўсё больш канкурэнтаздольнай на сусветным рынку, камп'ютэрныя класы — ледзь не ў кожнай школе, мабільны тэлефон — ледзь не ў кожнага школьніка... А прыслухаешся да таго, што і як гаворыць школьнік па мабільніку, наткнешся на адзін, другі пусты ці абыякавы позірк — і вяртаецца трывога: ужо і з газетаю ў руках мала каго стрэнеш, а кнігу — беларускую кнігу! — ужо нават бібліятэкі не набываюць.

Што ж мы — зноў духоўнасцю расплачваемся за дабрабыт, за новаўвядзенні XXI стагоддзя, не ўзгадваючы, ці не хочучы ўзгадваць, што іх можна — і трэба! — скарыстаць дзеля прымнажэння духоўнага набытку? А планы нашы, мары нашы? Не некаму ж — нам! — спраўджваць, здзяйсняць іх. Як дзеля дзяцей і ўнукаў сваіх, так і дзеля Айчыны сваёй.

Таіса БОНДАР

Запамінальная сустрэча

Гасцінна сустрэла беларускіх пісьменнікаў у Маладзечна Цэнтральная бібліятэка імя М.Багдановіча. У рамках правядзення 8-га Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў сценах гэтай установы прайшла прэзентацыя часопіса "Маладосць". Дырэктар бібліятэкі Ніна Артышэвіч распавяла гасцям пра чытацкія прыхільнасці наведвальнікаў бібліятэкі і асобна адзначыла папулярнасць "Маладосці" сярод вучняў старэйшых класаў і моладзі горада. Галоўны рэдактар выдання Раіса Баравікова ў сваім выступленні спынілася на асноўных накірунках і традыцыях, у якіх працуе рэдакцыя дзеля папулярызацыі маладой беларускай літаратуры. Намеснік галоўнага рэдактара Алесь Бадак падкрэсліў асобную ролю часопіса ў адкрыцці новых імёнаў у літаратуры. Аўтары "Маладосці", паэты Навум Гальпяровіч, Мікола Шабовіч, Таццяна Сівец, Янка Лайкоў падзяліліся са слухачамі сваімі ўражаннямі і прачыталі новыя вершы. Гучалі творы і мясцовых творцаў. Падчас імпрэзы гасцям было зададзена шмат пытанняў. Сустрэча прайшла ў атмасферы шчырай і зацікаўленай гутаркі.

Я.МЯДОЦКІ

Фота В. КАВАЛЁВА

Праз творчасць да ўзаемаразумення

Больш за 10 год доўжыцца творчае супрацоўніцтва паміж вучнямі Мінскай гімназіі-каледжа мастацтваў і гімназіі імя Генрыха Бёля, што знаходзіцца ў нямецкім горадзе Трайсдорф.

Іх папярэднія супольныя праекты былі прысвечаны пытанням экалогіі, дзеячам нацыянальнай культуры Беларусі і Германіі. Праект 2004 года пад назовам «Люстэрка» звярнуў увагу юнакоў на сродкі масавай інфармацыі як крыніцу ўзаемаразумення паміж народамі. На конкурсе "Маладыя шляхі ў Еўропе" ён быў прызнаны адным з лепшых міжнародных маладзёжных праектаў.

Сёння ў межах супрацоўніцтва разгортваецца новы праект «Я і мая біяграфія». Як і ранейшыя, ён здзяйсняецца пры падтрымцы Фонду Роберта Боша і складаецца з дзвюх сустрэч, адна з якіх ужо прайшла ў горадзе Трайсдорф. Яе ўдзельнікі наведалі музей дызайну, выставу Сезана, ездзілі ў Кёльн. У гімназіі імя Генрыха Бёля адбылася выстава твораў беларускіх навучэнцаў, на сцэне прайшлі невялічкія спектаклі.

А 17 чэрвеня ўжо Мінск прыняў гасцей з Германіі. Да гэтай сустрэчы юнакі падрыхтавалі ўласныя вершы на тэму "Свет і я". Плануецца прагляд аўтарскіх фільмаў-замалёвак. Адбудзецца фотавыстава — яе экспазіцыю складуць зробленыя ў Мінску фотаздымкі. Пройдуць майстаркласы па баціку, графіцы, нямецкія гімназісты паспрабуюць сябе ў

стварэнні экалагічных скульптур з дрэваў, травы. У праграме — экскурсіі ў Хатынь, Мір, Нясвіж, знаёмства з тэатральнымі прэм'ерамі Мінска.

"На кожным этапе адбываецца пошук новых форм адносін і ўзаемадзеяння, — удакладняе куратар праекта Галіна Глебаўна Пастухова. — Гэтым разам мы ўпершыню адпраўляемся ў беларускую глыбінку, на хутар. Там юнакі з Германіі найбольш поўна змогуць адчуць адметнасць беларускай культуры, гасціннасць нашых людзей і дабрыню іх душы".

Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ

Фота аўтара

Час гарачы. Выпускны...

Амаль 65 тысяч абітурыентаў прынялі ўдзел у тэсціраванні па беларускай мове, якое праходзіла ў нашай краіне 29 мая. Варта зазначыць, што менавіта родная мова стала першым з бясплатных цэнтралізаваных экзаменаў: усе расходы ўзяла на сябе дзяржава.

Між тым, вызначыць дакладны ўзровень сваіх ведаў менавіта па гэтым прадмеце жадаючыя мелі магчымасць значна раней — 17 красавіка, але на платнай аснове. Як паведамілі ў Мінадукацыі, ніхто, на жаль, не здолеў у той раз набраць сто балаў. Праўда, пры гэтым высветлілася, што больш як 2 тысячы чалавек валодаюць роднай мовай на "васьмёрку", "дзевятку" і "дзесятку". Будзем аптымістамі?

Што ж датычыць іншых экзаменаў, вырашыць, якім чынам іх здаваць, мае права сам экзаменуючы: можна — у школе, а можна і ўвогуле не здаваць — дастаткова прад'явіць сертыфікат з цэнтралізаванага тэсціравання, які абавязкова пойдзе ў залік. Дарэчы, сёлета вучням 11-х класаў трэба было "пераадолець" толькі тры экзамены, два з якіх — беларуская (руская) мова і матэматыка — абавязковыя. Трэцяе "выпрабаванне" яны... выбіралі самі! Заўважым, што з усім "камплектам" іспытаў школьнікі павінны былі справіцца ўжо да 16 чэрвеня.

Іна ЛАЗАРАВА

А для Вечнасці — Беларусь

У Выставачнай зале горада Бабруйска адбылася выстава "Алесь Адамовіч. А для Вечнасці — Беларусь", прысвечаная падпольшчыку і партызану Вялікай Айчыннай вайны, вядомаму бабруйскаму пісьменніку і публіцысту Алесю Адамовічу. Яе стваральнікамі выступілі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і дачка пісьменніка Наталля Адамовіч.

Кожны з наведвальнікаў змог на ўласныя вочы пабачыць асабістыя рэчы Алеся Адамовіча. Гэта і яго фотаздымкі са сваімі роднымі, сябрамі, вядомымі творчымі людзьмі Беларусі, і дакументы, членскія білеты, рукапісы ды кінасцэнарыі, а таксама дыпломы за ўнёсак у культурную спадчыну нашай краіны, кнігі беларускіх аўтараў з аўтографамі і ўласныя зборнікі пісьменніка.

Экспазіцыя выстаўкі дапамагла жыхарам і гасцям горада больш падрабязна даведацца пра жыццё і творчасць нашага земляка.

Наталля КАРАЛЁВА

Яшчэ зусім нядаўна на карце Мінскага раёна можна было ўбачыць кропкі з подпісамі Цна, Цнянка, Зацань, Навінкі, Ржавец, Кунцаўшчына, Масюкоўшчына. Усё гэта — вёскі, якія згодна з "літарай" указа Прэзідэнта і Генпланам забудовы сталіцы сталі яе законнай ускраінай. Вось так перастала існаваць чыясьці — дарэчы, і мая асабіста — малая радзіма: няма ўжо вёскі Ржавец, ёсць вуліца Ржавецкая. Так што памяць аб ёй у гісторыі захаваецца. Як і аб іншых "пайшоўшых з жыцця" маленькіх паселішчах, чые "імёны" атрымалі гарадскія вуліцы. Як складзецца іх сталічны лёс? Што чакае былых вяскоўцаў, набыўшых статус гараджан?

Сталічны глянец — учарашняй вёсцы?

Праблемная «спадчына»

— Кіраўніцтвам краіны вызначаны вялікія задачы ў сферы жыллёвага будаўніцтва: у гэтым ракурсе могуць — і павінны — быць асвоены далучаныя да сталіцы населеныя пункты, — паведаміў начальнік упраўлення рэгулявання забудовы Камітэта па архітэктуры і горадабудаўніцтве Мінгарвыканкама Аляксей Вага. — Ва ўсякім разе, зараз яны разглядаюцца як перспектыўныя тэрыторыі для далейшага развіцця горада Мінска.

Аднак падыход да атрыманай абласной "спадчыны" ў гарадскіх улад строга індывідуальны. Прынамсі, што тычыцца так званай паўночнай часткі (Навінкі, Цна, Цнянка, Зацань), толькі вакол Навінак чакаецца будаўніцтва шматпавярховых жылых дамоў. Праекты дэтальнай планіроўкі прадугледжваюць практычна поўнае захаванне прысядзібнага жылля, сукупнасць якога і ўяўляюць сёння гэтыя паселішчы. А новыя шматпавярхоўкі будуць абжывацца толькі на свабодных плошчах.

Няма пакуль што поўнай яснасці наконт таго, які архітэктурны "твар" займее колішняя Кунцаўшчына.

— Справа ў тым, што генеральны план прадугледжвае захаванне тут прыватнага сектара, — зазначыў Аляксей Вага. — Але, як лічаць многія мае калегі і асабіста я, у свой час была дапушчана памылка. Бо гэта — тэрыторыя са складанымі інжынернымі сеткамі, у зоне пешаходнай даступнасці да станцыі метро, якая неўзабаве адкрыецца. Таму пакінуць тут дамы прысядзібнага тыпу, маючы на ўвазе нізкую шчыльнасць забудовы і, адпаведна, невялікую колькасць жыхароў, — недазваляльная раскоша.

Таму і пачаліся пошукі іншага варыянта распрацоўкі гэтых плошчаў. На сённяшні дзень ужо ёсць канкрэтныя праектныя прапановы. Сярод іх — і знос існуючых забудоў. Працэс зацвярджэння неабходнай дакументацыі вымагае пэўнага часу, бо ў дадзеным выпадку патрэбна згода кіраўніка дзяржавы.

Па ўсім відаць, магчымы "задні ход" і ў напрамку развіцця наваяўленай вуліцы Ржавецкай: пад дыктоўку генплана сядзібы нядаўняга Ржаўца меркавалася сцерці з "твару" сталіцы, паступова замяніўшы іх на больш рэспектабельныя шматкватэрныя дамы. Аднак менавіта гэтая тэрыторыя апынулася ў "залатым" кальцы паміж Ждановіцкім рынкам і Драздоўскім

вадасховішчам — вельмі зайздросным для людзей, скажам так, нябедных. Дык ці варта здзіўляцца, што ў часы перадсталічныя тут былі парушаны ўсе магчымыя "параграфы" нормаў забудовы: раздадзена зямля, у тым ліку і ў прыватную ўласнасць, а яе гаспадары атрымалі афіцыйныя дазволы на ўзвядзенне дамоў сядзібнага тыпу.

Кропка ці шматкроп'е?

Як сталіца выйдзе з гэтай няпростай сітуацыі? Улічваючы той факт, што яе заложнікамі сталі, як ні круці, людзі законапаслухмяныя: калі дазволілі мясцовыя ўлады — чаму б не будавацца.

— На цяперашні час праектным прадпрыемствам "Мінскграда" распрацаваны тры варыянты развіцця гэтай тэрыторыі, — паведаміў Аляксей Вага. — Першы —поўны знос існуючай забудовы, другі — частковае захаванне прыватнага сектара, трэці — поўнае захаванне, з улікам прыгаданых абставін. У любым выпадку гаспадарам, якія маюць увесь пакет неабходных дакументаў, пры магчымым зносе будуць кампенсіраваны іх страты: заканадаўства дае магчымасць будаваць новы, раўнацэнны, дом, атрымаць грашовую кампенса-

цыю, добраўпарадкаванае жыллё.

Які з трох праектаў найбольш прымальны ў сэнсе затрат і эстэтыкі, мяркуецца вырашыць ужо ў чэрвені — на бліжэйшым архітэктурным савеце. Дарэчы, паставіць апошнюю кропку ў ланцужку ўсіх праектных пошукаў і вышукаў адносна новай гарадской уласнасці таксама мяркуецца ў другім квартале.

Чым яшчэ, апрача архітэктурных вытанчанасцей, узбагаціць сталіца былыя вёскі і іх насельнікаў? Дакладна вядома: чакаецца інжынернае добраўпарадкаванне — гэта значыць, сюды цэнтралізавана правядуць газ, ваду, належнае вулічнае асвятленне... З'явяцца прадугледжаныя нарматывамі аб'екты сацыяльнай інфраструктуры: можна будзе набываць прадукты, рамантаваць абутак, наведваць урача...

Таму, нягледзячы на тое, што свае вясковыя ўладанні мінскія гарадскія ўлады прынялі не ў лепшым выглядзе (у тым ліку, з пункту гледжання перспектыў горадабудаўніцтва), у Камітэце па архітэктуры ўпэўнены: новая палітыка ў галіне планіровачнай структуры, адэкватныя сітуацыі і патрабаванням часу архітэктурныя рашэнні здольны станоўча паўплываць на жыццё-быццё нядаўняга прысталічча.

Пакуль «суд ды справа»...

І ўсё ж... Здараецца так, што паміж радком генплана, які дыктуе знос, і самім яго працэсам праходзіць шмат часу. Махне рукой гаспадар на свае — і быццам не свае — уладанні: што вакол іх завіхацца, калі не сёння-заўтра "змахнуць"? Нават у цэнтры сталіцы хапае пабудоў з нявызначаным лёсам, ад выгляду якіх, прама скажам, плакаць хочацца. Ці не будзе гэтак сумна і ... выбачайце, сорамна за новыя ўскраіны? Як зазначыў Аляксей Вага, адносна маёмасці, што месціцца на гэтых плошчах, зараз не існуе абмежаванняў ні на прапіску, ні на адчужэнне (продаж, дарэнне...). За выключэннем вуліцы Ржавецкай (як тэрыторыі з рэгламентам пад знос сядзібнай забудовы), дзе, сыходзячы з адпаведных пунктаў Генплана і Кодэкса аб зямлі, мясцовым уладам забаронена перадаваць зямельныя ўчасткі ў прыватную ўласнасць грамадзян.

Што ж тычыцца жылля "пад знос", атрыманага горадам раней і ўжо займеўшага "пячатку" пэўных абмежаванняў, мой суразмоўца патлумачыў:

— Калі на ўчастку стаіць нармальны дом, дзе можна жыць, але патрабуецца рамонт, ніхто не забараняе гаспадару ім займацца. У тым ліку і капітальна. Проста нельга пашыраць жылыя плошчы. І ў гэтым, пагадзіцеся, ёсць свая логіка: гаворка ідзе пра тэрыторыі першачарговага асваення! Ну а ў выпадку, калі гаспадар б'е трывогу: маўляў, дома фактычна не існуе і рамантаваць там, адпаведна, няма чаго — трэба зносіць, мы згаджаемся. Калі ласка, зносьце! Будзе разгледжана пытанне аб выдзяленні вам новага ўчастка, у зоне захавання сядзібнай забудовы, — узводзьце дом там...

У рэшце рэшт, як высветлілася, за чалавекам захоўваецца права ў любы момант прадаць сваю маёмасць: новага гаспадара — непасрэднага — абавязаны прапісаць ва ўласным доме (за рэдкім выключэннем) нават пры ўмове ўжо ўведзеных на прапіску абмежаванняў. І гэты чалавек у перспектыве мае шанц на атрыманне добраўпарадкаванага жылля.

А пакуль "суд ды справа"... Спрачайся — не спрачайся, але ўлады ўпарта арыентуюць гаспадароў "падзносавых" сядзіб на тое, што эстэтыка ўласнага падворка — клопат, у першую чаргу, ягонага ўладальніка.

Інеса ПЕТРУСЕВІЧ

Фота забяспечана аўтарам

Галоўнае багацце дзяржавы



Па выніках Нацыянальнага конкурсу сродкаў масавай інфармацыі "Залатая ліцера", што ўпершыню праводзіўся ў гэтым годзе, у намінацыі "Лепшы дзіцяча-юнацкі часопіс" пераможцам прызнаны часопіс "Вясёлка".

Пра тое, чым жыве сёння адно са старэйшых дзіцячых выданняў Беларусі, а таксама пра ролю друкаванага слова ў справе выхавання юнага пакалення мы размаўляем з галоўным рэдактарам "Вясёлкі", старшынёй праўлення Беларускага дзіцячага фонду, пісьменнікам Уладзімірам Ліпскім.

Уладзімір ЛІПСКІ: "Задача сумленных дарослых — перадаць у спадчыну дзецям усё лепшае, стагоддзямі назапашанае нашымі прашчурамі..."

— Уладзімір Сцяпанавіч, калі ласка, акрэсліце першапачатковыя задачы, якія ставіць перад сабой рэдакцыя.

— Першая — далучыць дзяцей да роднай мовы. Другая — навучыць любіць, да слёз, зямлю, на якой яны жывуць. Трэцяя — прывіць павагу да людзей, якія вядуць іх за руку па жыцці. Гэтыя задачы актуальныя пры ўсіх "вятрах", пры ўсіх пераменах ў грамадстве. Яны сфармуляваныя класікамі беларускай літаратуры, якія стваралі і шмат гадоў запар падтрымлівалі святло "Вясёлкі". Як бы парадаваліся Янка Маўр, Васіль Вітка, Сяргей Грахоўскі, Алесь Пальчэўскі, Артур Вольскі, Еўдакія Лось, Анатоль Грачанікаў, ведаючы, што мы дастойна працягваем і развіваем традыцыі часопіса!

— "Вясёлка" на сённяшні дзень — гэта пятнаццаць тысяч асобнікаў. Вялікая лічба не толькі для дзіцячага выдання... Падзяліцеся сакрэтам, як сабраць такі тыраж?

— У 1991 годзе мы перажылі страшэнны перыяд, калі "Вясёлка" не выходзіла. Рынак пабіў нас аднымі з першых — і разам з тым загартаваў. Я тады паставіў задачу так наладзіць работу, каб нішто не зламала "Вясёлку". І вось ужо другі год у нас — самаакупнасць. Мы самастойныя. Своечасова аўтары атрымліваюць ганарары, супрацоўнікі — аванс, зарплату, дапамогу падчас адпачынку. Гэта вельмі важна.

А сакрэты простыя: трэба разумець рэаліі часу. Рэдакцыя павінна сама дбаць пра сябе. Мінула пара, калі рэдакцыйныя работнікі займаліся толькі творчасцю. Цяпер самі ствараем часопіс, прапагандуем яго, клапоцімся пра падпіску. Не сядзім склаўшы рукі. У вясёлкаўцаў праца не ў кабінеце за сталом. Наша задача — быць сярод чытачоў. Я, напрыклад, выступіў перад чытачамі сто дваццаць разоў за мінулы год. Так і Мікола Маляўка, і Мікола Чарняўскі, і Алесь Камароўскі — усе мы. У нас ёсць падшэфныя бібліятэкі, садкі — гэта не толькі ў Мінску, ездзім па ўсёй рэспубліцы.

Шчыльна працуем з аддзеламі адукацыі... Вось, напрыклад, у Мінску раней мала выпісвалі "Вясёлку". З просьбай дапамагчы ў падпісцы мы звярнуліся да старшыні Камітэта па адукацыі Міхаіла Сяргеевіча Ціцянкова. І ён адгукнуўся на просьбу, дапамог наладзіць сустрэчу з кіраўнікамі ўпраўленняў адукацыі ўсіх дзевяці раёнаў Мінска. Быў абвешчаны конкурс на лепшага падпісчыка, падрыхтавана выстаўка малюнкаў ад "Вясёлкі" для той школы-пераможцы, бібліятэчка кніг. Ад Камітэта па адукацыі ў падарунак быў вылучаны камп'ютэрны клас. Пасля выдалі загад па лініі Камітэта — праводзіць у школах сталіцы ўрокі "Вясёлкі" — накшталт урокаў пазакласнага чытаня. І цяпер адчуваем, што сталічныя дзеці чытаюць "Вясёлку".

— Даводзілася чуць крытычныя меркаванні, што абавязваюць школы падпісвацца на "Вясёлку". Вы не робіце сакрэту з таго, што ваш часопіс — у "разнарадцы" абавязковых для падпіскі навучальнымі ўстановамі?

— Што значыць "абавязваюць", "не раблю сакрэту"?.. Мне прыемна, што абавязваюць! "Вясёлка" — годны часопіс для таго, каб яго рэкамендаваць выпісваць... Вы паглядзіце, колькі ў нас робіцца для маленькіх чытачоў! Ёсць, напрыклад, рубрыка "Наша спадчына". Уяўляеце, якая гэта няпростая задача — расказаць самым маленькім, напрыклад, пра Еўфрасінню Полацкую? А мы знаходзім аўтараў, якія могуць гэта зрабіць. У выніку сабралася твораў на цэлую кнігу "Нам засталася спадчына".

Сёлетнія нумары мы пачынаем з віншавання чытачоў вядомымі людзьмі. Ігар Лучанок, Марыя Захарэвіч, Пётр Клімук, Міхаіл Савіцкі былі ўжо гасцямі нашай рубрыкі... І я лічу, што гэта выдатнае пачынанне. Можа, многія дзеці праз наш часопіс упершыню пачуюць пра славутых землякоў, зацікавяцца, у старэйшых распытаюць, хто яны. Гэта вельмі важна, бо сённяшні дзень "згубіў" героя. Вось адкрываю адзін камерцыйны дзіцячы часопіс. У рубрыцы "Куміры" — спявачка-аднадзёнка, якая спявае "Ху-ху-е, я скучаю по тебе"... Ну, які кумір з такімі песнямі? Чытаю біяграфію. Што добрага зрабіла? Аказваецца, нават ВНУ завочна не скончыла — а яе ў куміры... У адной школе на просьбу назваць сучасных куміраў прагучала прозвішча Жырыноўскага... Таму і хочам мы ўзбудзіць цікавасць да сапраўдных герояў. Пісаць пра тых людзей, якія любілі і любяць Беларусь, шчыруюць дзеля яе славы.

У нас ёсць "Тэатр Васі Вясёлкіна", дзе друкуем тэатральныя сцэнкі. Да вялікіх дат рыхтуем нумары: апошнія з іх — 60-годдзе Вялікай Перамогі. З нумара ў нумар вандруе фальклорная рубрыка "Кацілася торба"... Выбіраем усё лепшае, што робяць беларускія кампазітары для дзяцей і ствараем спеўнік "Вясёлкі", лепшых мастакоў далучаем да афармлення часопіса. Гэты год адметны ў "Вясёлцы" яшчэ адным унікальным праектам — на вокладцы мы даём выявы хлопчыка і дзяўчынкі ў строях розных рэгіёнаў Беларусі, выкананыя нашым мастаком, мастацкім рэдактарам часопіса Яўгенам Ларчанкам...

Наогул, часопіс на год прадумваецца так, каб яго матэрыялы маглі выкарыстаць настаўнікі як дапаможнік на ўроках. Знаёмім дзяцей з пісьменнікамі-юбілярамі, даём іх творы і кароткую біяграфічную даведку. І яшчэ шмат чаго іншага неабходнага і карыснага. Мы стараемся ісці ў нагу з настаўнікам і школай... Вымушаюць, абавязваюць альбо нагадваюць падпісвацца — тут можна розныя словы падабраць. Але, улічыўшы тое, што я сказаў, гэта правільна! Наш часопіс падказвае накірунак, у якім варта рухацца! Калі мы не выхаваем сёння маленькіх чытачоў, хіба яны будуць пасля чытаць "Бярозку", "Маладосць", "ЛіМ","Полымя", "Нёман"?.. Вось у чым справа! Мы — у падмурку вялікай дзяржаўнай палітыкі! Таму не грэх і падказаць, каб "Вясёлка" прыйшла ў кожную хату, у кожную кватэру, дзе ёсць дзеці.

— Уладзімір Сцяпанавіч, доўгатэрміновае планаванне, арыентацыя на класікаў — не заміна для маладых літаратараў? Чаму яны мала пішуць для дзяцей? Каб у "Вясёлкі" было больш магчымасцяў друкаваць маладых, можа, і пісала б іх больш?

— Мне здаецца,пастаноўка пытання не зусім правільная. Мы не арыентуемся на класікаў. Мы арыентуемся на ўсё лепшае, што ёсць на сённяшні дзень для маленькіх. Скажыце, калі ласка, каго мы адмовіліся надрукаваць? Прынцып у нас такі — глядзім не на твар, а ў твор. Калі прынёс чалавек твор, варты "Вясёлкі" і нашых чытачоў, абавязкова яго надрукуем!

У нас і рубрыка ёсць "Упершыню ў "Вясёлцы". Пагартайце часопіс уважліва! Мы адкрываем за год пяць-шэсць імёнаў і падтрымліваем іх! Гэта адна з найгалоўных задач — шукаць лепшае, прыцягваць да супрацоўніцтва і маладых, і старэйшых — усіх, хто можа пісаць! Колькі я, да прыкладу, пахадзіў за Віктарам Карамазавым, Анатолем Кудраўцом, Алесем Жуком, каб яны нешта для "Вясёлкі" напісалі! І, урэшце, нашы салідныя празаікі прынеслі унікальныя апавяданні для дзяцей.

А многія адмаўляюцца: маўляў, "Я яшчэ не здзяцінеў"... Лічу, што такія адказы — проста неразуменне дзіцячай літаратуры, яе ролі. Усе вялікія пісалі для дзяцей — згадаем А.С.Пушкіна, Л.М. Талстога, Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча... Гэта, можа, нават прыкмета вялікасці — здольнасць напісаць для дзяцей.

Калі прыходзіць пошта, мы ўсёй рэдакцыяй чытаем па чарзе дасланыя творы, пасля збіраемся разам і прымаем рашэнне, што друкуем... У рэдакцыйным партфелі пакідаем толькі ўсё лепшае.

З "Вясёлкі" сёння вырастае дзіцячая літаратура — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Па сутнасці, усе падручнікі для пачатковых класаў робяць па "Вясёлцы". І, разумеючы гэта, мы прад'яўляем сур'ёзныя патрабаванні да аўтараў. Іх творы абавязкова павінны несці нейкую маральную, выхаваўчую нагрузку... І новыя тэмы трэба падымаць, сучасныя, а не толькі пра тое пісаць, як прыехалі ўнукі да бабы з дзедам у вёску...

Яшчэ раз падкрэсліваю: "Вясёлка" адкрытая для ўсіх, хто здольны словам крануць дзіцячае сэрца.

— А ці можна спадзявацца, што "Вясёлка" стане выходзіць часцей і будзе таўсцейшай?..

— Усё магчыма, калі трывала стаць на ногі фінансава. Але пакуль задумка ў мяне, як у рэдактара, іншая: вылучыць з "Вясёлкі" дашкольнікаў. Бо зараз мы працуем на дзве катэгорыі — дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Гэта складаная задача. Дашкольнікам яшчэ трэба вывучаць азбуку і, увогуле, рабіць першыя крокі з імі. А сучасная пачатковая школа — сур'ёзны адукаваны народ! Вось нядаўна на адной з сустрэч мы атрымалі запіску: "Таварышы паэты, прачытайце вершы пра каханне. Дзяўчынкі 3 "А" класа". І гэта — нашы чытачы!

У межах "Вясёлкі" мы падзяляем іх, для маленькіх даём укладыш "Каласавічок". Але адчуваецца, што маглі б рэдакцыяй рабіць два рознаўзроставыя выданні. Ёсць матэрыялы, сур'ёзныя аўтары...

— Чаго, на ваш погляд, бракуе сучасным перыядычным выданням для дзяцей?

— Не толькі развесяліць, рассмяшыць трэба хлопчыкаў і дзяўчынак, а найперш — выхоўваць. Мы працуем з дзецьмі, з тымі, хто будзе заўтра кіраваць дзяржавай і прымаць рашэнні, як жыць краіне... Прасцей за ўсё даць дзецям забаўлянкі, прызы вылучыць: і завабіш публіку, і купляць часопіс будуць. Але ж, шаноўныя, гэта несумленны прыём, калі вы працуеце з дзецьмі! Калі вы прыйшлі на беларускі рынак, працуйце на нацыянальную ідэю!

Трэба так працаваць з дзецьмі, каб не было халтуры — гэта тычыцца і часопісаў, і бацькоў, і тых, хто робіць цацкі, шые для дзяцей адзенне... Усё павінна быць сумленна і з густам. Большага багацця, чым дзеці, у нас няма. Ні нафта, ні калійныя ўгнаенні, ні золата, якое, кажуць, знайшлі ў нас, ні лес, ні рэкі, ні азёры — менавіта дзеці. Яны ідуць з намі. Кожны дарослы павінен нешта рабіць для іх. І заўтра яны, увабраўшыся ў сілу, альбо аддзячаць нам, альбо будуць праклінаць. Пра гэта мы ўсе павінны думаць, бо кожны, усе разам і складаем дзяржаву.

— Уладзімір Сцяпанавіч, а як вы ставіцеся да прапаганды нацыянальнай ідэі на рускай мове? Калі піша газета, часопіс пра гісторыю, славутых людзей, культурныя каштоўнасці і г.д. на рускай мове?

—Давайце будзем сумленнымі! Моваў дзяржаўных можа быць некалькі. А родная — адна! Калі мы гэтага не адчуваем, не працуем на яе, не падтрымліваем, якія ж мы? Я не ведаю, хто, пішучы па-руску, на нацыянальным узроўні выйшаў да прызнання, каб застацца ў гісторыі. Такога феномена не можа быць. Творца праяўляецца ў нацыянальным! Гэта трэба разумець і выданням, і аўтарам перш за ўсё. Як можна навучыць на іншай мове да слёз любіць родную зямлю? Гэта — пустая стракатня! І гэта, магчыма, самае глыбіннае пытанне, якое імкнецца вырашаць "Вясёлка"...

— Чаго жадаеце "Вясёлцы" і яе чытачам?

— Мы хочам, каб "Вясёлка" ўвайшла ў кожны дом, дзе ёсць дзеці. Стараемся зрабіць ўсё, каб яна зачапіла душу дзіцяці і працавала на развіццё яго духоўнасці. Гэта, я лічу, самае галоўнае — не напоўніць галаву камп'ютэрнымі ведамі, а развіць душу. У сэрцах людзей, на жаль, накапілася многа злыбяды, адмоўных пачуццяў — і, на мой погляд, з гэтым напрамую звязаны многія беды, незвычайныя для чалавецтва прыродныя з'явы і катаклізмы. Задача сумленных дарослых — перадаць у спадчыну дзецям усё лепшае, назапашанае стагоддзямі нашымі прашчурамі.

Асобна вось што яшчэ хачу падкрэсліць. Мы павінны многа гаварыць з дзецьмі пра сям'ю, пра бацьку, пра маці. Хіба ты можаш зразумець іншых людзей, іншы народ, калі самых блізкіх людзей не навучышся любіць і шанаваць? Там, дзе моцная энергетыка сям'і, традыцый, радаводных каранёў — у Арменіі, Грузіі, блізкай нашай суседкі Эстоніі — няма бяды, на якую сёння хварэем мы. Трыццаць тысяч дзяцей у школах-інтэрнатах гадуе Беларусь — гэта ў асноўным сіроты пры жывых бацьках!

Вось і хочацца, каб усе мы дзяцей любілі, паважалі сям'ю і бацькаўшчыну, каб не множыліся многія беды, і толькі што згаданая — таксама. Я вывеў формулу: "Я + Я = сям'я", "Сям'я + сям'я = род", "Род + род = народ". А народ + народ = усе мы на Зямлі. Зразумець гэта трэба. Беларусь наша — светлая крынічка. І з яе трэба не толькі браць, але і ўзбагачаць, напаўняць душэўнай энергіяй. Таму трэба многа працаваць і сем'ям, і дарослым, і дзецям.

Мы ў "Вясёлцы", наколькі дадзена Богам таленту і сіл, таксама шчыруем у гэтым накірунку.

Павіншуем часопіс з узнагародай і пажадаем самаму яркаму, адметнаму, шчыраму зіхацець са старонак "Вясёлкі" фарбамі дабрыні і радасці: дзеці гэтага вартыя!

Гутарыла Алена МАСЛА

Нашы класікі ўмелі шанаваць простыя радасці пісьменніцкага жыцця, прычым публічна, г.зн. ва ўласных жа творах: менш чым сто год таму выхад паэтычнага зборніка мог пераважыць для шчаслівага аўтара шматвяковы цяжар самоты, што дасталася яму ў спадчыну. Сёння ж ці не кожная новая кніга паэзіі памянёную самоту не проста памнажае: здаецца, паэты вырашылі ахвяраваць вольным часам і асабістым жыццём, каб вынайсці як мага больш яе відаў, форм і гатункаў. Зрэшты, многія аўтары, што цягам апошніх двух-трох гадоў займелі першую кнігу (некаторым з іх прыемна думаць пра тое, як пра нейкі адмысловы перформанс, "Піт-дэбют"), заклапочаныя, аднак, зусім не пошукам разнастайнасці.

Наша светлае Сёння:
паэтычныя дэбюты ў «анатамічным тэатры»



"Неафіты" ад паэзіі нават суровага крытыка палохаюць пасляпоўным, нязломным (разлічаным, здаецца, на тое, каб перажыць вечнасць) скепсісам у дачыненні да перспектыў нашага свету; прычым упартасць, з якой яны муруюць свой *Нью-Вавілон*, публікаю нярэдка ўважаецца за сталы дыягназ.

Між тым, да *сталасці* (калі разумець яе як асобасную цэльнасць, выяўленую ў мастацкіх вобразах) ад падобных дэбютных кніг — як афарміцелю з клуба ў тутэйшай Юрздыцы, аўтару афішы індыйскага фільма "Кветка ў пыле" — да персанальнай выставы ў парыжскім Цэнтры Пампіду, нью-йоркскім Музеі Гугенхайма ці мюнхенскай Пінакатэцы сучаснага мастацтва. Вы не паверыце: няпісаная традыцыя айчыннай крытыкі вымагае ставіцца да творцаў-пачаткоўцаў надзвычай далікатна, тактоўна, узважана спалучаць карэктныя заўвагі з заахвочваннямі і г.д. Шкада, што колішнія заснавальнікі гэтай традыцыі не маюць шанцаў сутыкнуцца на адной сцяжыне з сённяшнімі дэбютантамі: ужо не пачаткоўцы (кніга як атэстат *сярэднесталасці*), яшчэ не класікі, але планы маюць надзвычай амбітныя. Крызіс *прамежкавасці*, што можа мець доўгатэрміновыя наступствы.

Асаблівай рашучасцю, ваяўнічасцю намераў вызначаюцца якраз тыя аўтары дэбютных кніг паэзіі, якіх ахвотна называюць *паэткамі* ці *паэтэсамі* нават тыя крытыкі, каторыя сябе не пазначаюць (насуперак праўдзе жыцця і словаўтваральнай аналогіі) *крытыкесамі*. Бываюць і выключэнні, сёння ў нас — рэдкія. Так, дэбютная кніга Таццяны Сівец "Ліпеньская навальніца", выдадзеная "Мастацкай літаратурай" у 2003 годзе, падаецца ў гэтым сэнсе "нейтральнай тэрыторыяй", якую татальная мілітарызацыя чамусьці не закранула. Ціхамірнасць пейзажаў і медытацый спн. Сівец (зрэшты, адносная: *"Бляск маланкі... Пасля... Цішыня... // Грукат грому памрэ і ўваскрэсне. // Шэпту дажджу // Я адкажу // Сэрца няўрымслівай песняй"* ("***Бляск маланкі...")) выглядае амаль букалічнай на фоне экстрэмізму (па-праўдзе — нейкага "гламурнага") іншых "неафітаў".

Як сведчыць Андрэй Хадановіч, менавіта Вальжына Морт хоць і выдала сваю першую *кнігу тэкстаў* "Я тоненькая як твае вейкі" (Мн., "Логвінаў"), куды ўвайшлі вершы, пераклады і проза, толькі сёлета, але ўжо "прышчапіла нашай паэзіі новы стыль". Сп. Хадановіч — з мілым мужчынскім какецтвам, якім у апошнія пятнаццаць год непазбежна ўзнагароджвае сваіх нешматлікіх выпускні***коў*** "факультэт нявест" (філфак БДУ), — называе яго "какетлівым дзявочым суіцыдам" (гл. паслясноўе "Вальжына vivante"). Ён жа настойвае на тым, што, перш чым астыць да вершаскладання, спн. Морт пакінула пасля сябе "некалькі эпігонак". Падтэкст, верагодна, наступны: можна было б гаварыць пра стварэнне цэлай "мартальнай" школы ў сучаснай беларускай паэзіі, калі б "эпігонкі" здолелі стаць "індывідуальнасцямі".

Не ведаю, каго меў на ўвазе паэт, перакладчык, выкладчык, літаратуразнаўца, аднак прыкладна адначасова са зборнікам В. Морт у кнігарнях з'явілася кніга Вікі Трэнас "Цуд канфіскаванага дзяцінства" (Мн., "Логвінаў", 2005); *"тут змешчаны аўтабіяграфічныя звесткі // гэта стыль суіцыдальны авангардызм"* ("Каляровы верш"). Калі б узнікла патрэба выдаць згаданым аўтарам дыпломы з адпаведнымі кваліфікацыйнымі адзнакамі, у абодвух у радку "Спецыяльнасць" можна было б пісаць **"літаратар"**, у радку "Спецыялізацыя" — ***"бамбіст"***, з удакладненнямі: "майстра какетлівага суіцыду", "майстра суіцыдальнага авангардызму". Мяркуючы ж па вершах, што ўвайшлі ў кнігу Вольгі Гапеевай "Рэканструкцыя неба" (Мн., "Логвінаў", 2003), яе паэтычная кваліфікацыя наўпрост звязаная з уменнямі і навыкамі **патолагааанатама** (прыводжу бяскрыўдна *шараговую* для яе цытату): *"на падлозе шкрабецца ня котка // на падлозе шкрабуцца нэрвы // яны лашчаць сваю сыстэму // аплятаючы косткі"* ("***на падлозе вандруюць не паперы..."). Заўважым, што юныя літаратары выпраўляюцца на малапаэтычную (прынамсі, у традыцыйным уяўленні) вайну, узброіўшыся не столькі арсеналам какецтва, колькі дзіцячай цікаўнасцю (параўнайце *"марцыпанавы снег"*, *"дзіцячыя позіркі"* з тэкстаў В. Гапеевай — і *"пластылінавыя вершыкі"* ды *"дзяцей, зробленых са сталі"* В. Трэнас), што нярэдка мяжуе з безуважнаю жорсткасцю. Калі адна гострыць зброю (*"Я зьбіраюся на вайну // кожную раніцу // чышчу боты — рыхтую зброю"* (В. Гапеева)), другая адпачывае (*"Я склала зброю. // Стаптала боты. // Зламала кіпці. // Пайшла дадому"* (В. Трэнас)). Не варта супакойвацца: яны ўвесь час мяняюцца месцамі.

Кніжна-паэтычны дэбют Ганны Ціханавай (маецца на ўвазе першы ("Фільтры") і другі ("Сны snow") раздзелы зборніка "Фільтры сноў" (Мн., "Логвінаў", 2003)) уражвае неадпаведнасцю абяцанняў (гл. анатацыю, паводле якой усе тэксты кніжкі "аб'яднаныя тэмай рамантыкі, настальгіі па дзяцінстве і юнацкім каханні") — і наяўных твораў. Быццам аўтар з кімсьці памяняўся марамі ды намерамі — і таго не заўважылі ні рэдактар, ні аўтар прадмовы.

"Адна з самых яскравых прадстаўніц творчага руху Бум-Бам-Літ" (Зм. Вішнёў), "часам летуценная, часам зямная і дэпрэсіўная" (ён жа), спн. Ціханава адважна ахвяруе нормамі граматыкі дзеля таго, каб прышчапіць-такі на дрэва беларускай паэзіі як мага больш пантарымаў (*"Шматкороп'і — // Шмат кроў п'юць..."*) ці адмысловай іроніі (*"Высновы толькі ранкам я зрабіла, // Што генію сучасся хачу быць // На яве зоркай, каб натхняць, свяціць..."*). Яна лёгка ахвяруе і звыклымі ўяўленнямі пра матэрыю — трэба думаць, дзеля пашырэння далягляду і ўплывовасці прыгожага пісьменства; не проста ж так безыменнаму вершу папярэднічае эпіграф ***"З анатамічнага"***: *"Ныркі вынырваюць ад болю, // Страўнік травіць. // І сківіца выскоквае набок. // На ўсіх сярчае сэрца"*. Наогул, многія "новаўкніжаныя" паэты абыходзяцца з мастацкім вобразам з той жа ўдзячнасцю, з якой колісь сюррэалісты праінтэрпрэтавалі паэтыку здзіўлення Гіёма Апалінэра: *surprise* пераперлі на *surprise surprise* — і з дзівоснай упартасцю спадзяваліся на тое, што прагрэсіўная публіка захопіцца *"мёртвым пацуком у мазгу страўніка"* (Ж. Рымбонь-Дасэнь) ці спасцігне таемны эратызм, уявіўшы: *"твае ногі бы звязка ключоў на шчыкалатках п'яніц рамеснікаў"* (А. Брэтон). *"Конскія вочы ляжалі на скрыжаваньні. // Конскія вочы ляжалі на скрыжаваньні // поту са сьнегам. // Мне ня вусьцішна, мне проста сьпякотна // да вачэй ісьці па снезе бяз скуры"*. Апошняя цытата — ужо не якое-небудзь французскае ці нямецкае адкрыццё, **гэта наша ўсё** (гл. "Вогнішча з конскіх вачэй" у кнізе спн. Морт).

Зазначым, што відавочна большая цярплівасць — *талерантнасць!* — Г. Ціханавай і асабліва В. Трэнас у дачыненні да самога паняцця "паэтычнасць" прывяло да з'яўлення ў іх кнігах тэкстаў, дзе надзвычай рэчыўная і разам з тым празрыстая метафорыка ўсё ж святкуе перамогу над прагматычным канструктывізмам (згадаем вершы спн. Ціханавай "***Фактурнасць камення і цела...", "Вятрыска", а таксама "П'есу", "Калыханку", "Анёлу. Брату" спн. Трэнас). Гэта нагадвае перамогу расліны над жалезнымі кратамі — перамогу відавочна крохкага над уяўна непарушным. Цікава толькі, мы становімся сведкамі трыумфу ілюзіі ці ілюзіі трыумфу?..

Чым на самай справе можна падмануць/завабіць сённяшняга чытача — дык гэта аптымізмам.

Чым, бадай, і можа быць уратаваная сёння Паэзія ад рашучай дэбютанцкай цікаўнасці дазнацца, а якога ж колеру кроў у Ягамосці, — дык гэта рэгулярнымі прышчэпкамі самаіроніі.

У 2003 годзе Джэці (Вера Бурлак) сабрала свае вершы пад назвай "За здаровы лад жыцця" (Мн., "Логвінаў"). Сённяшнім светам, як кажа мая бабуля, сама "шыльда" падаецца агрэсіўна аптымістычнаю (ці агрэсіўна патрыятычнаю — залежыць ад канкрэтнага "дэфекту" крытычнага зроку). *"Я вясёлая занадта дзеўка. // Пры занадта сумным існаваньні // Я — бы недарэчная прыпеўка // На грамадзка значным пахаваньні"*. Працытаваны верш "Занадта вясёлая" і тэкст "Руку да нагі" варта чытаць штодзень па тры-пяць разоў крытыкам, што пакутуюць на іпахондрыю ды мізантропію; да верша "Свабоду графаманам" праз кожную гадзіну раім звяртацца юным і вечна юным дэбютантам дзеля ўмацавання творчага імунітэту. Кніга Джэці (асабліва ў параўнанні з ужо згаданымі зборнікамі) уражвае няпохапкавасцю, *невыпадковасцю* — і тэкстаў, што склалі кнігу, і самой кнігі. Нават **мартальнасць** (што паўстае сёння, зрэшты, хваробаю не толькі "неафіцкаю") скарыстоўваецца дзеля ўмацавання аўтаравай генеральнай лініі: *"А вы, як мой кардэбалет, // Ля сьценак уставайце ў шэраг // Бо куля — мост у іншы сьвет, // На сьветлы і высокі бераг!"* ("Таварыш Зе"). Прапануецца арганізаваць побыт у нашым ***сёння*** дасціпна і з агеньчыкам. У іншасвет — з транспарантам!..

У шэрагу "неафіцкіх" выданняў выхад зборніка вершаў Наталлі Кучмель "Імгненні" ў серыі *"Дэбют"* (Мн., "Мастацкая літаратура", 2005) падаецца, па меншай меры, недарэчнасцю. Бо першая (!) *кніга* гэтага аўтара адбылася як паўнавартаснае *выбранае*. Паэзія вымагае не меншай часавай "выгрымкі", чым тая ж проза. (Паказальна, што і ў В. Гапеевай, і ў Г. Ціханавай, і ў В. Морт паэтычныя нізкі ў зборніках "дагружаюцца" п'есамі ці прозай з перакладамі. Ствараецца ўражанне, быццам аўтары імкнуцца прэзентаваць чытачу плён не толькі сённяшніх, але і будучых здзяйсненняў, мала спадзеючыся на тое, што дэбютны зборнік калі-небудзь станецца зборам твораў.) У пейзажыстыцы, якая пераважае ў "Імгненнях", імпрэсіяністычнасць паэтычнай тэхнікі мае вынікам надзвычай рэчыўныя вобразы — такія "аскепкі" быцця, у якіх люструецца ўвесь аўтараў сусвет, ад камянёў да ценяў: *"Дзень паўпрылёг на горад і раку // Празрыстым, цёплым, быццам летнім, целам. // Павольна падаўшы, не шамацела // Лісціна, абмінаючы руку"* ("***Дзень паўпрылёг на горад і раку..."); *"Стосам блытаных ліній // Быццам ніці з асновы, — Залатое на сінім // Голле ў вечар вясновы"* ("***Стосам блытаных ліній..."). Спн. Кучмель расказвае простымі словамі аб простых рэчах, і, здаецца, "тэхналогія" словатворчасці выключна празрыстая, *агульнадаступная*, а інтанацыя яе *інтымных пейзажаў* відавочна адсылае да "Песні песняў"... Не кніга, а ідэальны трэнажор для "неафіта"-крытыка. Будзем усё ж гуманнымі: каб калега не высільваўся, мусім прызнацца, што ў выпадку з "Імгненнямі" самая скрупулёзная аналітыка наўрад ці ўганаруецца трыумфам пранікліваcці. Я магла б патраціць не адзін год на даследаванне стылю Н. Кучмель — і наўрад ці растлумачыла б (найперш сабе самой), у якое імгненне сукупнасць літараў перараджаецца ў недасяжнасць Паэзіі: *"Неба лікуе, пацямнелі брады; // Чайкі святкуюць вызваленне вады. // І на шклёным балконе, дзе панує пыльная цьма, // Для інжыра ў вазоне скончылася зіма"* ("***Неба лікуе...").

Ergo: прыемна думаць, што той, хто не ўпадае ў транс ад тваіх захадаў-адкрыццяў ці папросту не ўхваляе тваіх мілітарысцкіх настрояў, — рэтраград, альбо дурань, альбо пазбаўлены густу ёлупень, альбо зласлівае стварэнне з комплексамі і пухлінай мізантропіі ў вобласці сумлення.

No pasaran!

А цяпер дапусцім, што "вораг" — не маразматык (pardon — кансерватар!), да таго ж відавочна схільны да самаіроніі, і комплексаў у яго не больш, чым у літавангарда нашага "рэвалюцыйнага". І ў гэткага персанажа айчыннага літаратурнага працэсу таксама ёсць шанц перажыць экстаз падчас пагружэння ў паэзію "бамбістаў" — як падчас эксклюзіўнай вандроўкі ў іншасвет ці цягам элітнага адпачынку ў пекле. Сёлета ў рускім перакладзе выйшла кніга эсэ іспанскага пісьменніка, ваеннага журналіста А. Перэса-Рэвертэ пад назвай "З намерам абразіць", дзе ён выступае абвінаваўцам сваёй эпохі, але і аддае ёй належнае. Той, хто сёння выдае кнігу паэзіі ***з намерам напалохаць*** (у самых розных сэнсах), мусіць памятаць, што сённяшні чытач, які паспеў ужо здзічэць у сіліконавых джунглях масліту, сам каго хочаш напалохае.

Ірына ШАЎЛЯКОВА

Фота Паўла Эзерына

Пошукі святла

У 1991 годзе ў часопісе "Полымя" былі апублікаваны асобныя раздзелы з рамана "Архірэевы скарбы" Зінаіды Дудзюк. Доўгім быў шлях твора да самастойнага жыцця, ажно чатырнаццаць гадоў чакаў свайго часу, пакуль у 2005 годзе не выйшаў асобным выданнем пад назваю "Год 1812" у Брэсцкім выдавецтве "Акадэмія".

Напісаны з гуманістычным пафасам, твор раскрывае адну з драматычных старонак у жыцці нашага народа. У рамане мы бачым яскравыя, па-мастацку выпісаныя карціны ваеннага і мірнага жыцця, мноства каларытна намаляваных персанажаў, розных чалавечых лёсаў.

Пісьменніца прапагандуе гуманнае стаўленне да чалавечай асобы. Адсюль пракляцце вайне і ўсім, хто яе распачаў. Трагічная і горкая праўда аб вайне і чалавеку на вайне выступае як аснова зместу і галоўная праблема, якая па-мастацку даследуецца ў кнізе. Вайна адлюстравана так, як яна ёсць — без ідэалізацыі. Гэта бясконцая страляніна, жыццё на валасок ад смерці, голад, холад, марадзёрства. І забітыя, параненыя.

З. Дудзюк гнеўна выступае супраць такой бесчалавечнай з'явы, як марадзёрства. Абурэнне і злосць выклікаюць нахабныя французы, "якія замест таго, каб ваяваць, разбрыліся па свеце і рабуюць людзей, спрабуюць нажыцца на вайне", якая забірае шчасце, надзею, робіць сяброў ворагамі.

Пісьменніца паказвае сябе тонкім псіхолагам, вельмі дакладна перадае нам псіхалагічнае становішча чалавека ў час вайны, яе непрыманне сумленнай, чулай асобай. Такім у творы з'яўляецца Панас Паланейчык, якога вучылі, што забойства — грэх. Але на вайне гэты закон не дзейнічае. Тут існуе другі — калі ты не заб'еш, заб'юць цябе. Духоўныя прынцыпы ўваходзяць у разлад з ваеннымі. Ад людзей патрабуецца забіваць, красці і рабаваць. Тое, што вайна калечыць душы, вельмі дакладна перадаюць словы Панаса: "Я зжыў сваё жыццё за гэтыя некалькі месяцаў, у мяне душа старога і нямоглага чалавека".

Асуджаючы вайну, З. Дудзюк вядзе барацьбу за чалавечае ў чалавеку. Пісьменніца сцвярджае, што, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, пакуты, трэба заставацца чалавекам. Гэта даказвае і Міхал Ляснеўскі, калі, убачыўшы жывых людзей, якіх пакінулі на полі бою, бяжыць у шпіталь і патрабуе, каб іх забралі, а адказ лекара, што "няма куды іх браць, усе шпіталі перапоўненыя" выклікаюць у яго душы гнеў, абурэнне. Гэта і Панас Паланейчык, які, згадзіўшыся ісці рабаваць чужы дом, цягаючы з горада прадукты, не-не ды і ўспомніць часам пра запаведзі.

Жудаснасць вайны, яе страшную сутнасць пісьменніца паказала ўвёўшы ў твор вобраз гувернанткі Марылі, жанчыны, якая пакідаючы Маскву, апынулася на беразе Беразіны і загінула пад нагамі сваіх жа людзей. Страшнае гэта здарэнне і таму, што Марыля была растаптана разам з ненароджаным дзіцём, маленькім чалавечкам, якому так і не давялося ўбачыць свет.

Значнасць твору надае і тое, што З. Дудзюк адлюстравала лёс духавенства, становішча праваслаўных святароў, якіх прымусілі прыняць каталіцтва і прысягу на вернасць Напалеону.

Акрамя шляхты і духавенства паказала пісьменніца і становішча сялян, якім у гэты неспакойны час напалеонаўскага нашэсця прыйшлося найцяжэй, яны моцна пакутавалі, бо французы не саромеючыся забіралі ў іх коней, ежу, збожжа. Перад вачыма паўстаюць вельмі каларытныя вобразы Сахвейкі, яе сяброўкі Мальвіны, старой Сынклеты, Домны, Саўкі і яго жонкі Мані, Самуся і Мацея, іх маці. Кожны персанаж намаляваны з такой праўдзівасцю, з такім добрым веданнем чалавечай душы, што, пры чытанні старонкі, прысвечаныя гэтым няшчасным, загубленым жыццям, выклікаюць непадробны сум, абурэнне, нянавісць да чужынцаў.

Адметнасцю рамана з'яўляецца наступнае сцверджанне: вайна 1812 года для Беларусі не была Айчыннай. Так, народ Расійскай імперыі ўспрыняў напалеонаўскае нашэсце як замах на нацыянальную незалежнасць Айчыны. Ён пачаў з небывалай мужнасцю абараняць Радзіму. Іншае становішча назіралася ў той час на Беларусі. Асноўная частка насельніцтва не падтрымала Напалеона. Сяляне спачатку паверылі французам, але калі ўбачылі, што вызвалення ад Напалеона не будзе, пачалі бунтаваць, выступаць супраць ворага. Але гэта нельга назваць нацыянальна-вызваленчай барацьбой, бо галоўнай мэтай народа было зберагчы сваю маёмасць і сем'і.

Раман Зінаіды Дудзюк "Год 1812" — значны ўклад у беларускую літаратуру. Ён прасякнуты гуманістычным пафасам, непрыманнем вайны, тут закранаюцца важныя агульначалавечыя праблемы, уздымаюцца філасофскія пытанні жыцця і смерці, сэнсу чалавечага жыцця, а таксама робіцца спроба стварыць у літаратуры вобразы рэальных гістарычных асоб, такіх, як, напрыклад, Іван Насовіч і Іван Грыгаровіч.

"Год 1812" ствараўся больш, чым праз стагоддзе пасля гэтых падзей. Калі параўнаць гістарычныя рэаліі таго часу і XX стагоддзя, то можна адчуць, што сапраўды гісторыя паўтараецца, калі людзі не здольны з яе ўрокаў зрабіць належныя высновы. "Хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае — асуджаны зноў перажыць яго. Безліч разоў". Сітуацыя сапраўды паўтараецца, чалавецтва не жыве ў міры і спакоі. І сёння вядуцца войны.

Ганна ЛЫСАЯ

ВЫДАННІ



У серыі "Скарбы сусветнай літаратуры" выйшла кніга **Альбэра Камю**, куды ўвайшлі раман "Чужаніца", аповесць "Падзенне", апавяданні, п'есы і эсэ ў перакладзе з французскай мовы Зміцера Коласа.



У серыі "Беларуская проза XX стагоддзя" пабачыла свет кніга выбранага **Міхася Стральцова "Ад маладзіка да поўні"**. Яна складаецца з апавяданняў розных гадоў, аповесцей "Адзін лапаць, адзін чунь", "Загадка Багдановіча", эсэ.

Серыя "Беларуская паэзія XX стагоддзя" ўзбагацілася кнігай **"Душа мая тужлівая"** — своеасаблівай анталогіяй паэзіі 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя. Лёс пятнаццаці паэтаў, творы якіх увайшлі ў гэта выданне, амаль аднолькавы — яркі, адметны прыход у літаратуру, жаданне мастацкім словам данесці свае думкі, перажыванні... І амаль аднолькавы трагічны лёс чакаў іх наперадзе. Паэзія А. Дудара, У. Жылкі, Ю. Лявоннага, Ю. Таўбіна і іншых, вытрымаўшы выпрабаванне часам, будзе цікавая і сённяшняму чытачу.

"На взлете счастья" — першая кніга празаіка **Кацярыны Хадасевіч-Лісавой**. Вострасюжэтны раман пра сённяшні дзень, у якім псіхалагічна дакладна выведены характары маладых людзей, што імкнуцца ў бізнес, і тых, якія хочуць жыць вальготна за чужы кошт.

«Расці, каліва!..»


Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

КАЛІВА

Зборнік паэтычных і празаічных твораў

Мінск 2005

...Верш з такой назвай, напісаны Аленай Багамолавай, адкрывае чарговы зборнік паэтычных і празаічных твораў літаратурнай суполкі "БУКет", створанай на базе БДУ культуры і мастацтваў. Гэта ўжо чацвёрты зборнік, выдадзены суполкай. Уласна пра "БУКет", а таксама пра папярэдняе наша выданне ўжо пісалася (гл. Шостак А. "Вясновая завіруха кропель" //"ЛіМ", 18 чэрв. 2004), таму варта спыніцца непасрэдна на сёлетніх творчых дасягненнях маладых літаратараў.

Вельмі сімвалічная назва кнігі — "Каліва", як, дарэчы і згаданы верш, размешчаны замест прадмовы. Зазначу, што ў беларускай мове існуюць два значэнні гэтага слова. Па-першае — "каліва" — гэта парастак, з якога пачынаецца жыццё расліны; як нам уяўляецца — гэта асобная расліна, якой споўнілася толькі чатыры гады, а наперадзе, будзем спадзявацца, — бясконцасць. Па-другое — "каліва" — гэта "трошкі", "не шмат". Ва ўсіх гэтых сэнсах зборнік апраўдаў сваю назву. Ён атрымаўся невялікім, але ў ім захаваліся творчыя почыркі аўтараў, іх непаўторнасць, імкненне да самарэалізацыі шляхам літаратурнага натхнення.

Так цудоўнай паэтычнай вобразнасцю прасякнутыя вершы Паўла Алейніка. Аўтар у сваіх "эцюдах" і "накідах" імкнецца знайсці эстэтычнае адчуванне паўсюль: ці то ў закінутым старым доме, ці ў звычайных пэрых днях, або ў незвычайнай казачнай жар-птушцы.

Наталлю Смерцеву традыцыйна кранаюць пытанні трансцэндэнтнага сузірання свету, паўсюдных пошукаў вышэйшай існасці. Прынамсі, маладая паэтэса звяртаецца да сімволікі сусвету каханкаў, яго надзвычайнай счэпленасці, замкнёнасці, і, у той жа час, бязмежнасці.

Гама вершаў Наталлі Кузьміч наскрозь "каляровая", іх гучанне навявае, нібы ветрык, спакой і суцішэнне:

Кропелькі з караляў
Па парванай
Нітцы прабачэння
Падаюць і скачуць
Сярод хваляў
Кропкай сказу.
Кропкай заканчэння.

Айна Бялова, нібы малое прыгажосцю свайго чароўнага свету, а хутчэй нават сусвету, мора ўласных пачуццяў, перажыванняў, думак...

Любоў Даніленка стварае "акварэльнымі" фарбамі-словамі ліпеньскі "эцюд". Яркі і выразны гукапіс (паўтор мяккіх л', н', в') падкрэслівае суладдзе яе думак, пачуццяў з наваколлем:

У ліпені ліпы цвітуць,
і арэлі
Нас гойдаюць гонка
з зямлі да нябёс,
І пэндзлік-прамень
бярэ з акварэлі
Ўсе фарбы вясёлкі —
малое мой лёс.

...Некаторыя вобразы сусветна значных узораў мастацтва, безумоўна, могуць натхніць на стварэнне літаратурных твораў. Так, напрыклад, верш "Броненосец "Потёмкин" паэтэсы і барда Астрадэні, напісаны паводле знакамітага фільма С. Эйзенштэйна.

Варта зазначыць, што да "БУКета" ў канцы мінулага года далучыліся новыя "калівы" — Вольга Рагавая, Ганна Урбан, Іван Дашкоў. Творы Івана маюць спалучэнне казачнасці і рэальнасці, алегорыі і канкрэтыкі. Ганна Урбан звяртаецца да вобразаў-духаў сусветных стыхій. А Вольга Рагавая звяртае ўвагу на адвечную праблему лёсу, жыцця і хуткаплыннасці часу.

...Калі трымаеш новую кнігу, якая яшчэ пахне друкарскай фарбай, часам не задумваешся пра яе стваральнікаў... Тут, як у фільме, многа хто застаецца "па-за кадрам" і не пазначаны нават цітрамі... Таму хочацца падзякаваць усім, хто прымаў удзел у выданні "Каліва".

Зборнік заканчваецца таксама сімвалічна: рытарычным пытаннем-маналогам Марыны Шымчык, на які павінны адказаць усе мы — людзі XXI стагоддзя: "Темно на улице... и грустно на душе... // Как будто я бреду назад в XX век..." Аднак прасветлая назва зборніка мае аптымістычны змест: мы — адзінае каліва і, у той жа час, "суполка каліваў", мы не можам ісці назад, мы цягнемся да сонца!..

Адам ШОСТАК

Анатоль ШУШКО

Вясеннія паразуменні з Уладзімірам Караткевічам

Трыпціх

"На Беларусі бог жыве", —
І няхай давеку жыве.

1

У добрае і верыцца — бо вераць! —
У дбайнасць і святочнасць спазаранку.
Жыццё уточвае у нас памеры:
Світанне і святую калыханку.

Каб тое і другая адналько́ва
Душы жывыя струны казыталі,
Каб зіхацела роднай мовы слова,
Каб мудрае з удалым — Доляй сталі.

2

Адзінаплынны сокі і вытокі.
Радзімнаверны птушак
рэйны вырай.
Парыпваюць узімку нашы крокі,
Каб за вясною разамкнуцца шырай.

Жыццё кідае вечную пальчатку
Сабе: на добры,
спагадальны сорам.
Ніхто не мае права мець пячатку
На целе размаітага узора.

Адпрэчваецца холад ад уціску,
Смакуючы ахвоту маладосці:
— Свет-сонейка, высокае,
стань блізка.
Ідзі ў сваты сюды, да ягамосцяў.

3

Іду па суквецці — па радасным свеце —
Па любай і гожай зямлі.
Іду басанож,
каб знядбаць ліхалецці:
— Знябудзеце вы хоць калі!?

Ляцяць трапяткія пялёсткі і крылы
І песніць жаўронак наўсцяж.
Мацуе на промнях руладныя сілы
Жыцця,
Што імкне на прасцяг.

І роснаму кроку і светла,
і шчасна
У свежамурожнай траве,
І слова, што вызнаў аршанец,
П Р Ы Ў К Р А С Н А
Па-веснему ўдалеч заве.

Сват

Было у Брагіне гэта.
Адно зачынаўся дзень,
У хату, як з апраметнай,
Знаёмца мой заляцеў:

— Ці чуеш, браток!?
Заўчора
Маліла Домна мяне
Магілу выкапаць скора.
Стагнала: "Бачыла ў сне".

Нібы прадчувала — хутка.
І я — далакоп Віктор.
Дык, мо,
каб не ныць пакутна,
І — пухам зямля,
— па сто?

Дарэчы, прашу ў падмогу...
Напарнік зваліўся з ног.
Як-небудзь, зямляк, патроху.
Няцяжка тое, дальбог...

Раз'ясніўся дзень экранам.
І сум, і ціш на кладах.
Здаецца, стуліў старанна
Ваколле нябесны дах.

Нятуташняму нялішне
Згадаць, што чым мог — памог.
І я па сцяжынцы нішкам
Свой крок скіраваў дамоў

— Куды?! Тут нельга дахаты.
Па мне —
як грэх на душу.
Хаўтуры спраўляць — святы.
Калі ж па праўдзе, скажу —

Пакрыўдзіш старую надта.
Яна прасіла мяне,
Шаптала: "Пабудзь за свата.
Зямелькаю абвінеш".

І гэта мяне — латругу,
Скалечанага турмой...
Дык двойчы зямля ёй пухам,
Да скону ўспаміне мой!

Няўзнак праслязіўся Віця,
Але мяне за сабой,
Настырны, цягнуў:
"Не піць як
З чарнобыльскаю бядой?

Не упарціся, недарэчна.
І дол ты капаў — з душой..."
І быццам па Шляху Млечным,
Я ўслед за людзьмі ішоў...

Хаўтурная "урачыстасць".
Нямоўкныя скаргі, плач.
Прапраўнучкі голас чысты
Ля вокан гайсаў наўскач.

А потым, у змрок зацяты,
У брагінскай гамане
Зноў чуў я: "Пабудзь за свата.
Зямелькаю абвінеш".

Пра памяць

"Забыць Герастрата"? —
І гора,
І страта...
Жывому — жывое,
Гадуй!
Разумныя людзі
Гавораць багата
Пра хлеб і пра соль,
Пра ваду.

Навекі ганебна —
Скарынку у хлеба,
Што кепку,
Сарваць — не аддаць.
Патрэбна,
патрэбна,
патрэбна,
Як неба,
Давеку зямлі спагадаць.

З татам

Майму ветэрану з пашанай

... — Свята — калі шчырасці багата,
Годнасці у песеннай душы.
— Дык на тое, — кажаш, —
Толя, й свята.
Пакажы, раз ёмкі, — апішы.

Сонца, сыне,
промнямі уточыць
Сярод нас святыні з вышыні,
Каб ніхто не здагадаўся збочыць
З боскае сцяжыны —
дабрыні...

— Тата, я ж пра Свята вызвалення
Ад фашысцкай нечысці сляпой...
— Мой ты!
Свет у промнях пакаленняў:
Прашчур... я і прапра...
праўнук твой.

Усевалад ГАРАЧКА

Старыя вершы

Н.

Чытаю твае вершы,
І нібыта бачу тваё аблічча.
Чаму ты яго пакінула там,
У мінулым?
Чытаю твае вершы,
І здаецца,
Што і маё аблічча засталося там,
У мінулым.
Нібыта там,
У мінулым —
Мы разам,
Нібыта мы — два дрэвы,
Што выйшлі з адзінага кораня.

Але ці чужыя мы сталі цяпер:
Два дрэвы,
Што разам цягнуцца ў неба?

2005

* * *

Чатыры сасны пры дарозе
А станеш між імі —
Нібы над табою — званіца,
Над галавою званы.
Ахутае цябе
Дзіўны гук,
Дзіўны водар,
Абрынешся ў пазачассе...

Ачнешся,
Таропка адыдзеш убок —

Чатыры сасны пры дарозе,
Не болей.

2005

* * *

Бог размаўляе з намі,
А мы не жадаем слухаць,
Крычым:
— Дзе Ты ёсць?!
Адгукніся! —
І чуем уласныя словы.
А Бог размаўляе з намі,
І словы Яго — дзеі,
Але — мы Яго не чуем.

2003

Паэзія

Камень грэць,
Каб потым сагрэцца
Ля каменя?

В. Слінко "Паэзія"

...Як па снезе пайсці,
Не разбіраючы сцежак,
Да сонца,
Да вясны,
Да цяпла.
Не знайсці іх.
І потым сагрэцца
Ад уласных слядоў
На снезе,
Што абяцалі прывесці
Да сонца
Да вясны,
Да цяпла.

2005

ВІНШУЕМ

- З 80-гадовым юбілеем празаіка і літаратуразнаўцу Лідзію АРАБЕЙ.
- З 70-гадовым юбілеем паэта, перакладчыка, літаратуразнаўцу, крытыка Васіля ЗУЁНКА.

ЮБІЛЕЙНЫ КАЛЯНДАР

У чэрвені споўнілася

◊ 110 гадоў з дня нараджэння беларускага літаратуразнаўцы, паэта, грамадскага дзеяча Ігната ДВАРЧАНІНА.

◊ 110 гадоў з дня нараджэння пісьменніка, дзеяча нацыянальнага руху Заходняй Беларусі Леапольда РОДЗЕВІЧА.

◊ 105 гадоў з дня нараджэння славутага беларускага празаіка, драматурга і публіцыста Кузьмы ЧОРНАГА.

◊ 105 гадоў з дня нараджэння празаіка, публіцыста, перакладчыка Міколы ЦЕЛЕША.

◊ 100 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага паэта, празаіка, грамадскага дзеяча, народнага паэта Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі Петруся БРОЎКІ.

◊ 100 гадоў з дня нараджэння пісьменніка Лазара ШАПІРЫ.

◊ 100 гадоў з дня нараджэння празаіка Юркі ВІЦЬБІЧА.

◊ 95 гадоў з дня нараджэння крытыка і драматурга Алеся КУЧАРА.

◊ 90 гадоў з дня нараджэння паэта і перакладчыка Дзмітрыя КАВАЛЁВА.

◊ 70 гадоў з дня нараджэння паэта Івана ЛЕТКІ.

Фота В. КАВАЛЁВА

Палёт зніча

Васіль ЯКАВЕНКА

— Сяльцо наша невялікае, а нядолі шмат, — казаў, хаваючы вочы ў тоўсты каўнер кажуха, вязень Барыс Кіта. — Нядоля, бяда — яны шырока па свеце раскіданы.

— Але ж, грыміць, грыміць вайна амаль на ўсіх кантынентах, толькі нам у гэтай нары не чуваць нічога, — адгукнуўся настаўнік па прозвішчы Грынь, які ляжаў поплеч на струхлелай саломе, яму, як і Кіту, шылі сувязь з партызанамі, а яшчэ карыстанне радыёпрыёмнікам.

— Я страшэнна рады, што ты мой калега-настаўнік. Толькі ж хай бы нам собіла сустрэцца не тут, дзе чэрці вараць смалу. Мы ж варты большага.

— Наша вартасць цяпер нам жа ў дакор. А той, хто нічога не варты, хто ўсяго толькі запарушвае жыццё — свой грэх у мех і сам наверх!

— Я мяркую, мой чалавеча, што гэта пройдзе. Прафесія настаўніка неўміручая, як, зрэшты, і лекара. Толькі лекар лечыць цела, а настаўнік дае веды і выхоўвае, выстройвае прастору для душы. Я любіў рабіць гэта і аднойчы, калі зачынілі беларускую гімназію ў Навагрудку, выцягнуў адтуль на вучобу ў Вільню цэлую плойму дзяцей, чым і ганаруся, яны ж у людзі выйшлі... Задача настаўніка, як я гэта бачу, зрабіць чалавека з таго матэрыялу, які ёсць у жыцці, і гэты чалавек абавязкова павінен быць патрыётам зямлі роднай, Бацькаўшчыны.

— Праўду кажаце, спадар Кіта.

— Дзякуй, шаноўны...

Сярод пакутнікаў манашага лёху, пераважалі сяляне; яны час ад часу цяжка ўздыхалі і ціха перашэптваліся.

Усе яны, лікам каля трыццаці чалавек, сядзелі ў цёмным муры колішняга каталіцкага манастыра ў Глыбокім, што на Віцебшчыне, і святло да іх ледзь прабівалася праз невялічкае заледзянелае і задымленае акенца, праўда, калі хто наважваўся падкінуць дроў і адчыняў дзверцы чыгуннай печкі, якая бязбожна дымела, яго твар азараўся цяпельцам, і то праз дымавую заслону чалавек бачыўся невыразна. Дзеля таго, каб захаваць вочы, якія еў дым, Барыс Кіта і прыкрываўся кажушынай.

Ішоў чацвёрты тыдзень, як Кіту арыштавалі па дарозе з Паставаў на Маладзечна — уласна, ехаў у вёску Лебедзева, дзе яго чакала сям'я; ехаў цягнікам, а на станцыі Крулеўшчызна мела быць перасадка, там да яго і прычапіліся паліцэйскія, як што вёз дарожную карзіну, поўную розных прысмакаў, кілбас, вяндліны, — ці не для партызанаў? — а з кішэні, як на допыт, вывернуў больш за тузін паперак, розных пасведчанняў, аусвайсаў, што сабраліся за год ці болей; цяпер яны таксама выклікалі падазрэнне.

Уласна, прыгадваючы тое, што надарылася, вязень Кіта ўжо неаднойчы пераказваў небаракам, якія падзялялі з ім тут брутальна незайздросны лёс: штоноч іх выклікалі па прозвішчах і выводзілі кудысьці за манастырскі дзядзінец ды расстрэльвалі — чалавек па 20 — 25... А на іх месца наганялі новых. На допыце, які з высокай ласкі да Кіты вёў сам пан Левандоўскі, начальнік глыбоцкай паліцыі, дамагаліся паказанняў, што ён, Кіта, меў сувязь з партызанамі і англійскай разведкай. Потым Левандоўскі спытаўся, маўляў, калі ён працаваў дырэктарам Пастаўскай гімназіі, то хто з асоб, якія яго ведаюць, маглі б за яго паручыцца. Барыс назваў Гадлеўскага, інспектара адукацыі, і Скурата ў Мінску, яны працавалі пры адміністрацыі Генеральнага камісара і Беларускай Народнай Самапомачы. Пасля гэтага з допытамі ад яго адчапіліся, але ж не выпускалі з турмы. І не ведаў тады асветнік Кіта, як, магчыма, не ведаў і пан Левандоўскі, што палымяны патрыёт беларускасці ксёндз Гадлеўскі, які за невялікі час адчыніў на Беларусі ажно сорак тысяч школ, цяпер сядзіць таксама за кратамі, і яму шылі сувязь з аліянтамі.

Напэўна, не аднаго Кіту ў 1941-42 гадах жыццё кідала знізу ўгору і з гары ўніз. І часта, і з найвялікшым размахам. Кіту асабліва... То ён пан, то прапаў... То ў выніку дзвюх паездак у Мінск, і асабліва пасля другой, калі завёз загадчыку аддзела адукацыі Сівіцы свіны кумпяк, вярнуўся ў Маладзечна з дазволам адкрыць там настаўніцкую семінарыю; сходу напісаў і распаўсюдзіў афішы, набраў выкладчыкаў, а ахвотнікаў вучыцца ў семінарыі, мяркуючы па заявах, было ажно 300 чалавек. Трыумф! Гэта ж адразу гэтулькі маладых і адданых Беларусі галоў можна вывучыць і падрыхтаваць да жыцця, да справы... Распачалі заняткі, і — на табе! Ураганам наляцеў на Маладзечанскую семінарыю вілейскі гебітскамісар Шміт: як так, маўляў, без яго ведама і дазволу адчынілі навучальную ўстанову ды яшчэ сярэдняга класа! Гэта ж падкоп пад нямецкі новы парадак, ліха на вас, свінні!.. Ды ўжо ці не замнога для вас і Вілейскай семінарыі?! Хто тут ініцыятар? Дырэктар... І тут дырэктар паказвае яму дазвол... Найн! Не тое... А ў турму не хочаш? Я-я... І давялося Кіту зноў уцякаць у Лебедзева, а потым — у Мінск, дзе б яго абаранілі. Толькі ж сябрук Яхім Скурат, намеснік, параіўся са сваім загадчыкам аддзела Сівіцам, які быў ці то чэшскім ці то польскім немцам, а можа, і наогул палякам — між сабой, дарэчы, яны гаварылі на французскай мове... Параіўся; толькі ж яны не ўзяліся яго бараніць, як што фармальна, паводле прадпісанняў фюрэра, не павінны былі адчыняць семінарыю... Азадачаны, анепакоены Скурат раз-пораз чухаў за вухам, нібы ў гэтае вуха і павінна была ўляцець аднекуль падказка, што рабіць далей з Барысам, палымяным асветнікам, які быў даволі-такі збянтэжаны ходам падзей. Абзваніў ён па тэлефоне некалькі гарадоў, выклаў тыя размовы Сівіцы, праінфармаваў Гадлеўскага і прапанаваў Барысу, нарэшце, вось што: едзь, дружа, у Паставы, у гасцінны і добры гарадок на Віцебшчыне — там пасада дырэктара семінарыі вольная... "Дык гэта ж за светам, на другім канцы Беларусі!" — занепакоіўся тады Барыс. А Яхім яму: ехаць давядзецца, там патрэбны талковы дырэктар, абяцаю табе, што гэта не надоўга. Гнеў Шміта ўляжацца, і мы адчынім у Маладзечне семінарыю, бадай, пад новай назвай... Гэта ж не адступленне, гэта манеўр, своеасаблівы ход у палітыцы, дадам, нашай палітыцы.

Скурат правёў Барыса праз пост кантролю ў Доме ўрада, жадаў яму ўдачы, і тут Барыс пацікавіўся, ці ж не прыязджаў больш на Беларусь Мікалай Шчорс? Аказваецца, не прыязджаў, толькі брат Шчорса — Барыс, здаецца, настаўнічае ў Барысаве. Сказаў так...

Абняліся, развітваючыся.

Ад успаміну пра тое расстанне на душы ў Кіты і цяпер цяплей робіцца і, лежачы на падлозе ў муры, ён шкадаваў, што пра ягонае ўтрыманне ў турме Яхім нічога не ведае... У Глыбокім, аднак, працаваў прадстаўніком Беларускай Народнай Самапомачы Нікандра Мядзейка. От ён ад прыяцеляў і даведаўся пра Кіту і аднаго разу, калі вязняў выводзілі на прагулку, перакінуўся з ім некалькімі словамі ды паабяцаў перадаць з нейкай аказіяй у Лебедзева для Ніны паперку з паведамленнем, дзе згубіўся яе чалавек. Сам Мядзейка хадайнічаў аб пераводзе Барыса Кіты адсюль у Вілейку, каб змягчыць турэмны рэжым для яго.

Схуднеў і аслаб Барыс так, што адчуваў, як душа трымаецца за адзін толькі хрыбетнік. Кармілі ж зрэдку, і найчасцей у якасці харчу ім кідалі сырыя буракі ў акенца, зробленае ў дзвярах. Такая акалічнасць, дарэчы, падкрэслівала, што іх тут маюць за скаціну.

Дык вось гэтыя зігзагі, пра якія ўночы, у чаканні смерці, Кіта расказваў знябытым людзям — паплечнікам сваім па манастырскай юдолі, — каб не даць іх душам змарнець, апусціўшыся ў абладу страху. І як добра было ў тых Паставах, калі ён, як спрактыкаваны асветнік, прыняў на сябе семінарскія клопаты, і калі стварыў той блаславёны асяродак беларушчыны, дзе гартавалася нацыянальна-свядомая моладзь. Колькі парасткаў, колькі талентаў бралася там у рост. Дбалі ж педагогі не толькі пра адукацыю, але і пра эстэтычнае выхаванне на ўроках музыкі, спеваў, на занятках літаратурна-драматычнага гуртка і нават балетнага...

Усё гэта было і радавала, і радаваліся бацькі за настаўнікаў і за такога дырэктара, якога, шчыра кажучы, палюбілі, таму і гэтулькі аддзякі, каўбас ды іншых апетытных, не тут будзь сказана, прысмакаў паклалі яму ў дарожную карзіну (плацілі ж бацькі настаўнікам збажыною альбо прадуктамі харчавання), калі ён ужо ехаў адтуль у Маладзечна, каб на дазвол, які ўсё-ткі быў атрыманы ў начальства, заснаваць там адміністрацыйна-гандлёвую школу. Душа яго была на сёмым небе ў гэтай дарозе да жонкі і сына-малечы, да сваякоў, дзе ён чуў сілы і моц, каб яшчэ больш разгарнуцца ў асветніцкай працы. Аж у Крулеўшчызне паліцыянты зграблі яго душу і гвалтоўна зачынілі ў настылы лёх, куродымны і вашывы.

Новы вязень Пархімчык у гэтым цьмяным людскім гурце, злепленым у камяк, расказваў, як патрапіў сюды за сувязь з партызанамі. А якая ж там была сувязь, адзін Бог ведае. Зайшлі да яго на хутар партызаны, калі ішлі на чыгунку, пэўна, каб міну падкласці, слядоў нарабілі ў снезе, і па тых слядах немцы выйшлі на двор Пархімчыка ды за каршэнь яго самога, і вось табе маеш. Даволі тыповая для гэтага гурту ў манастырскім скляпенні гісторыя.

Настаўнік Грынь у гэту ноч усё нешта варочаўся, быццам вошы поедам елі яго. Што б яшчэ магло непакоіць?..

Нарэшце ён павярнуўся да Барыса дый пытаецца:

— Шаноўны, які нумар абутку ты носіш?

— Сорак першы, — адказаў Кіта ў здзіўленні. — А што? Цяперыча на маіх нагах валёнкі...

— Я вось што хачу сказаць, шаноўны... Чуе маё сэрца, што зараз прыйдуць па маю душу, а ў мяне ж на нагах чобаты з дыхтоўнага хрому. Дазволь, Барысе, я пакіну іх табе. Не адмаўляйся, калі ласка.

— Не-не, даражэнькі, я не прыму ад цябе чобаты, дый у такіх варунках... Мяне ж таксама жывым не пакінуць.

— Бог збераж... Не адмаўляйся. Я не хачу, каб чобаты ворагам засталіся. А ты чалавек... Я ганарыцца буду! Я спакойна тады пайду на смерць.

— Не-не, не магу я, прабач.

— Шкада, я парэжу іх...

— Паслухай, дружа, я калісьці чытаў Стэфана Жэромскага. Што запомнілася? "Не час шкадаваць ружы, калі гараць лясы!" Не крыўдуй...

Тады Грынь змоўк. Прыціхлі, уражаныя іхняй размовай, і тыя, хто слухаў яе. А неўзабаве, праўда, і пачуліся там, за дзвярыма, імклівыя і цяжкія крокі, заскрыгаталі дзверы ў завесах. Кіта пахаладзеў ад жаху, напружаныя мышцы цела дробна калаціліся. І пэўна, гэтак жа рэагаваў на з'яўленне наглядчыка з паліцыянтамі кожны. Ліхтар асвяціў ушушканых у лахманы людзей на дне скляпення.

— Асвейка... Дрозд... — пачаў зачытваць наглядчык, — Алісейка... Грабчык, Навумаў... Грынь...

Настаўнік імгненна, рэзка, нервова зварухнуўся, прыўзняўся на калені і, сціснуўшы кулакі ў роспачы, кінуў іх долу:

— Гады!

І кожны з пакліканых, перарывіста дыхаючы, неахвотна, а то і з вывергнутай сакавітай лаянкай уздымаўся на ногі, ішоў да дзвярэй, шырока расчыненых ужо на той свет.

— Астапчык... — чытаў далей з ліста наглядчык, — Кі... Кі-кі...

Душа ў Кіты зусім нырнула ў пяткі.

— Кісель, — урэшце вычытаў той, — Собалеў...

Калі жахлівы пералік закончыўся, наглядчык спытаўся:

— Ці ўсе выйшлі? — і асмеліўся пажартаваць: — Можа, з імі яшчэ хто за кампанію пайсці хоча? Не?..

Грынь кінуў ужо ад дзвярэй:

— Бывайце, таварышы! А памром — за нас жывыя адпомсцяць. Не зламаць Беларусь!

Яму грукнулі ў плечы прыкладам, і дзверы з лязгатам зачыніліся. Адно ў цішыні чуваць былі несуладныя крокі, яны аддаляліся, выклікаючы слабое водгулле ў сутарэннях манастыра, і тое згасла.

Рэшта вязняў не спала пасля моцнага нервовага зрыву.

— Гаспадар Пархімчык, — у поцемках звярнуўся да знаёмага селяніна Барыс Кіта, — Бог да вас літасцівы таксама.

— Гэта сёння, а што заўтра будзе? — і ўздыхнуў: — За чужое лычка раменьчыкам плацяць.

— Ведаеце, даражэнькі, мне цяперака прыгадваецца польская турма на Лукішках, дзе я сядзеў за беларускія справы разам з іншымі шчырымі хлопцамі. Каб гэта можна было, то я памяняў бы гэтую вязніцу на тую.

— Бачыш ты, якое жаданне...

— Не-е, там таксама не цукар і, каб нехта сказаў тады, што я буду яшчэ марыць пра такое, як там, зняволенне, не паверыў бы, плюнуў бы ў вочы, але... смешна цяпер.

— І чаму гэта над намі праз усё жыццё чыняць здзек? — спытаўся другі мужык.

— Вось-вось, гэта пытанне з пытанняў, шаноўныя. А мяне ж і за саветамі хацелі за краты кінуць... Нас, браце мой, саджалі ў турмы за тое, што мы шукалі адказу на пытанне, якое вас цяперака турбуе..

У хвіліны, калі гамана ў манашым лёху заціхала і чуўся сонны храп, ва ўяўленні Кіты паўставаў мост цераз рэчку Мядзёлку ў Паставах восеньскай парою — па вадзе плылі апалыя кляновыя лісты барвяна-жоўтага колеру. Прырода млява ішла на спачын.

На мосце Барыс выпадкова сустрэўся з інспектарам школ Пастаўскага павета Пятром Шчасным, які да яго прыезду сюды сумяшчаў працу на тым вышэйшым становішчы з пасадай дырэктара гімназіі. Як адчуў неўзабаве Кіта, уступаць сваё дырэктарства інспектару ўжо не надта і хацелася, хоць яны са Шчасным і былі добра знаёмыя — адны сцежкі тапталі ў Віленскай гімназіі. Кіту ж прыслалі ў Паставы з Мінска, з чым Шчаснаму варта было лічыцца. І трывалі яны адзін аднаго датуль, пакуль Кіта, ігнаруючы "новы парадак", не пачаў набіраць у гімназію групы падлеткаў, сярод якіх пракідаліся і палякі.

Узніклі са Шчасным спрэчкі акурат з-за палякаў; той даводзіў, што ні фармальна, паводле нямецкіх загадаў, ні маральна гэтага нельга рабіць — хіба ж даўно, прыгадаем, ляхі перакрывалі доступ у вучэльні для беларускай моладзі?! А Кіта даводзіў сваё: нашы вучні, якога б паходжання яны ні былі, будуць паважаць нас і наша імкненне да нацыянальнага самавызначэння, да таго ж не варта пераймаць горшае ад сваіх ворагаў... Яму проста шкада было тых польскіх хлопчыкаў і дзяўчынак, не хацелася пакідаць іх невукамі. Шчасны стаяў на сваім, і вось тады на мосце ён пагражальна сказаў Кіту:

— Глядзі, Барыс, калі не адумаешся, не выйдзеш ты жывым адгэтуль!

Цяпер у голаў вужакаю лезла думка: няўжо Шчасны аказаўся здольным на такі зламысны ўчынак, на помсту яму за яго перакананні і прынцыпы, па якіх разгортвалася жыццё ў Пастаўскай гімназіі, няўжо гэта ён заклаў яго ў Крулеўшчызне глыбоцкай паліцыі?

Адказу нават не было як прыдумаць.

Яшчэ праз колькі пакутлівых дзён пан Левандоўскі падпісаў распараджэнне аб пераводзе вязня Кіты, аброслага, дарэчы, чорнаю барадой, высахлага ў шчэпку, у Глыбоцкую цэнтралю СД. Везлі ж яго туды цягнікам скутага, бы звера, а там упіхнулі ў камеру, дзе сядзела шмат вязняў. На ягонае прывітальнае "дабрыдзень" нехта выгукнуў:

— А вошы ты нам прывёз ці не?

— Даражэнькія, каб толькі клопату пра вошы... Ёсць паразіты і больш адмысловыя, ведаеце...

— А ты смерці баішся?

— Ну, што вам сказаць? Не так страшна смерць, як яе прылады.

У словах, у чыстай і годнай беларускай мове адразу ўгадвалася асоба, і да яго больш ніхто не чапляўся, калі не лічыць дзяжурнага па прозвішчы Генрых Сянкевіч... Гэты боўдзіла біў Кіту па галаве гумавай дубінкай, калі іх выводзілі на прагулку. Ад удару ў Барыса іскры сыпаліся з вачэй... Як высветлілася неўзабаве, Генрых падазраваў у Кіту яўрэя, паводле знешнасці: адкрыты лоб, шчокі запалыя, чорная барада, толькі вочы не ўсохлі і ў абліччы ўсім дамінуюць — вялізныя, ад голаду мо, у іх гнеў, страх і сум.

Аднаго дня, калі вязняў павялі — бы на свята — у лазню мыцца, за імі следам увязаўся і паліцыянт Сянкевіч у якасці сышчыка. Мужыкі распрануліся, голыя, і Сянкевіч — шась да Кіты ў надзеі ўбачыць пацвярджэнне таму, што перад ім яўрэй, а ў таго вісюлька чын-чынам, быццам схаваная ў кішэнь дуля. Пацёр нават вочы — без галюцынацый... І сыты Генрых, абманутый ў сваіх спадзяваннях, як сцерва, віляючы жарнаўцамі*, паплёўся з прылазніка на вуліцу. Няўдача ў яго...

У Вілейцы працаваў даверанай асобай пры гебітскамісарыяце акругі былы вучань Кіты (у Віленскай гімназіі) Кастусь Касяк. Вось на яго і выйшла край занепакоеная спадарыня Ніна, Кітова жонка, з весткай пра свайго чалавека. Кастусь прыняў яе вестку блізка да сэрца і сказаў, што будзе лічыць за гонар для сябе памагчы Кіту і, праўду сказаць, дабіўся яго вызвалення.

Барыс Кіта на волі — быццам ў другі раз нарадзіўся на свет. Хутка патрапіўшы ў Лебедзева, ён трохі адляжаўся, трохі ад'еўся і зноў бардзэй за працу. У лічаныя тыдні адчыніў у Маладзечне адміністрацыйна-гандлёвую школу і распрацаваў для яе праграму, зноў жа на свой густ.

І ў каторы ўжо раз лёс зігзагам чырканув і палез, пайшоў угору, па-новаму ўздымаючы зніч яго жыцця.

---

*Жарнаўцамі – клубамі (Віцебшчына). – Рэд.

Шчаслівы за часам не сочыць. І час не ўладарыць над шчасцем... Пра існаванне гадзінніка, здаецца, забыліся ўсе. Усе — апроч арганізатараў і журналістаў, для якіх два дні ды дзве ночы VIII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2005" былі распісаны ці не па хвілінах. Ды ўрэшце кожны так або іначай мог адчуць, што жыве ў агульным нашым беларускім доме Фестываль Шчасця. Непаўторны і моцны духам сваім. Бо чыстым рамантычным духам поўняць-сілкуюць атмасферу свята родная песня, беларускае слова, глыбіннае, не напаказ, патрыятычнае пачуццё.

Другога такога няма



I

Мова статыстыкі наўрад ці прыдатная для перадачы творчай ауры, святочных эмоцый, эстэтычных уражанняў. Ды ўсё ж: сем вялікіх музычных праграм, чатыры з якіх падрыхтаваў Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі на чале з маэстра Міхалам Фінбергам; амаль паўтара дзесятка літаратурных сустрэч і столькі ж імпрэз, наладжаных самадзейнымі творчымі калектывамі горада і раёна; каля 600 удзельнікаў; плошча-зала, увечары запоўненая публікай па самыя берагі, — а гэта тысяч пяць "уседлівых" і шматкроць большая колькасць гледачоў-слухачоў на шпацыры па прылеглых вуліцах (усяго каля 50 тыс. чалавек).

На Беларусі толькі два музычныя форумы ладзяцца сёння пад патранатам Прэзідэнта нашай краіны: "Славянскі базар" у Віцебску" і другі — Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі. Умоўна, фармальна другі. Але колькі нашых суайчыннікаў назавуць яго першым! Першым і адзіным.

З чаго ўтвараецца своеадметнасць гэтай у самым добрым сэнсе папулярнай, масавай і ў той жа час "адзінкавай", унікальнай з'явы нашай культуры?

Усе імпрэзы фестывалю вызначае спакроўленасць з лепшымі даўнімі традыцыямі роднай зямлі, апярэзанай скрыжаваннямі еўрапейскіх дарог-пуцявін; з каларытным тутэйшым характарам і мудрай ментальнасцю. Канцэрты вылучае нацыянальны вобразна-паэтычны лад, родная музычная інтанацыя, жывы гук і жывое беларускае маўленне. У адрозненне ад буйных міжнародных праектаў, дзе пануюць праграмы-дывертысменты, складзеныя з паасобных разнажанравых нумароў, на гэтым фестывалі пераважаюць тэматычныя праграмы-прэм'еры з цэласнай унутранай драматургіяй. І яшчэ адно істотнае адрозненне: тут не ладкуюцца камерцыйныя канцэрты высокааплатных эстрадных зорак. Вось і шматлюдная руплівая "зорная каманда" Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі на чале з М.Фінбергам выступала бясплатна, ганарар (не вышэй як 50-80 тыс. беларускіх рублёў!) прызначаўся толькі тым артыстам, што не працуюць у складзе знакамітага заслужанага калектыву.

"У гэтага фестывалю ёсць сэрца", — маэстра знайшоў для маладзечанскай падзеі, бадай, самае лаканічнае і трапнае вызначэнне. Паспрабуем ягоны афарызм расшыфраваць?

II

Сэрца фестывалю — гэта людзі. Людзі... з мелодыяй у сэрцы і гармоніяй у душы. Нават калі самі яны мастацтвам і не займаюцца. Маладзечна збірала-яднала творчыя таленты музыкаў і арганізатараў, майстроў паэтычнага слова і настаўнікаў, руплівцаў народнай культуры, асветнікаў і шчырых аматараў прыгожага. Такія людзі сустракаліся ў школе і ў бібліятэцы, на прэзентацыі часопіса "Маладосць" і ля сцэнічнай пляцоўкі ў гарадскім парку, на стракатым кірмашы рамёстваў, на выстаўцы дзіцячай творчасці, у штабе фестывалю і ў яго прэс-цэнтры. Нейкія эпізоды тых маладзечанскіх стасункаў ды гутарак з'явяцца ў нашых будучых публікацыях. Штосьці, вядома ж, так і застанецца занатоўкамі ў блакноце.

А, дарэчы, што там, у фестывальным нататніку?

Там — пра нашых паэтаў: па дарозе ў Маладзечна яны хваляваліся, як школьнікі перад іспытамі, дэкламавалі вершы Уладзіміра Караткевіча. Маэстра Фінберг "прымусіў" перачытаць класіка, выбраць блізкія сэрцу радкі, вывучыць і выйсці на фестывальную сцэну ў праграме "Быў, ёсць, буду". Яшчэ ў мінулым сезоне "ЛіМ" звярнуў увагу на унікальнасць новай працы аркестра і кампазітараў, у выніку якой закрасавала, набыўшы яскравыя музычныя фарбы, кветка паэзіі Караткевіча (раней у эстрадным песенным жанры былі ўвасоблены 2 ці 3 яго вершы, цяпер іх амаль 30, і амаль кожная песня — са сваёй іскрынкай, залацінкай, таямніцай). "Маладзечна-2005" прэзентавала гэтую прэм'еру на высокім узроўні, прысвяціўшы 75-годдзю з дня нараджэння Паэта. Кранальным эпіграфам прагучаў над плошчай запіс яго духоўнага запавету-звароту: "Брату майму па сонцу, мэце, продках і мове. Дзе б ты ні жыў..."

"Братам па мэце і па мове" выступаць перад гэткай вялікай аўдыторыяй аказалася справай няпростай, ды яшчэ — не з уласнымі творамі. Але "паэтычны дэсант" у песенным канцэрце-манаграфіі трымаўся годна: публіку ўразіла і трапяткая мелодыя голасу Раісы Баравікова, і ўпэўненае мужнае чытанне Навума Гальпяровіча, і...

І наогул, фестывальныя сустрэчы з беларускімі літаратарамі (у Маладзечне выступалі Раіса Баравікова, Алесь Бадак, Навум Гальпяровіч, Віктар Шніп, Мікола Шабовіч, Янка Лайкоў, Таццяна Сівец — каб жа яшчэ гэтае кола было шырэй!) пераканалі: іх слухаюць неабыякава і, што вельмі важна, — да іх гатовыя прыслухоўвацца нашы сучаснікі, за якімі — будучыня і годнасць маладой незалежнай Беларусі.

III

Будучыня, годнасць, незалежнасць... Гэтыя паняцці мы ўспрымаем-трактуем у кантэксце традыцый, гісторыі, а таксама рэальнага часу. Сёння, калі свет адзначае 60-годдзе Перамогі над фашызмам, а на беларускім календары — ужо 61-шы год Вялікага Вызвалення ад гітлераўскага ярма, высокі сімвалічны сэнс набываюць тыя песенныя матывы і радкі, што нагадваюць пра падзеі мінулай вайны і ўсенароднага змагання. "Ішла вайна народная", тэатралізаваная песенная прэм'ера Дзяржаўнага канцэртнага аркестра, — сур'ёзная і арыгінальная работа, у якой спалучылася і наша папулярная песенная класіка ("Радзіма, мая дарагая" У.Алоўнікава), і фрагменты цыкла У.Мулявіна "Праз усю вайну" (пераклады тэкстаў на беларускую зрабіў В.Жуковіч), і новыя творы (Э.Зарыцкі, В.Раінчык, У.Елісеенкаў...).

Будучыня, годнасць, незалежнасць... Хіба не пра гэта клапоцяцца захавальнікі народна-інструментальных і песенных традыцый ды руплівцы нашага музычнага адраджэння? Якую прастору для ўзнёслых эмоцый і разваг далі выбітная сінкрэтычная праграма нашага магутнага, "зыкагалосага" Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г.Цітовіча на чале з прафесарам Міхасём Дрынеўскім! Ці канцэрт "Ад родных ніў", прэзентаваны аркестрам народных інструментаў Цэнтра культуры

і мастацтваў Магілёўскай вобласці, — з маэстра Леанідам Івановым. Ці спатканне вытанчаных музаў — знаёмых нам шляхетных апякунак нясвіжскага, заслаўскага, мсціслаўскага фэстаў...

Яны сустрэліся ў супольнай імпрэзе артыстаў Дзяржаўнага канцэртнага аркестра (камерныя калектывы пад кіраўніцтвам Валерыя Сарокі, Ніны Аўраменкі, Мікалая Волкава, Генадзя Забары, Барыса Нічкова ды Генрыха Гедыльтара) і Сімфанічнага аркестра Маладзечанскага музычнага вучылішча імя М.Кл.Агінскага — з яго знаным кіраўніком Рыгорам Сарокам. Тое "спатканне музаў" у раскошным Гарадскім палацы культуры суправаджаў, як заўсёды жывы і захапляльны, навукова-асветніцкі каментарый Вольгі Дадзіёмавай. Гучалі выбраныя творы беларускай музыкі мінулых эпох і ўжо нашага стагоддзя. У пранікнёнай гармоніі інструментальных галасоў ажылі старонкі творчасці таленавітых беларускіх меладыстаў XX стагоддзя А.Туранкова, У.Солтана, ужо класічная спадчына Л.Абеліёвіча, Я.Глебава. А візіт нашага знанага сучасніка Валерыя Іванова ў Маладзечна быў адзначаны сюрпрызам: з яго твораў, выкананых удзельнікамі праграмы, склаўся прывабны для слухачоў міні-бенефіс. Вядома ж, упрыгожвала праграму наша музычная даўніна, і луналі ў зале неўміручыя вобразы Міхала Клеафаса Агінскага... Пра сувязь яго імя з маладзечанскай зямлёй трэба распавядаць асобна. Пэўна, свежую старонку ў гэты расповед неўзабаве ўпіша Мінскі абласны драматычны тэатр, што працуе ў Маладзечне: тут рыхтуецца прэм'ера спектакля "Фантазія ля мінор", героем якога будзе наш зямляк ...

IV

І яшчэ пра землякоў. "Маладзечна — мой дом" называлася аўтарская вечарына Алега Елісеенкава, вялі якую таксама колішнія маладзечанцы С.Бароўская ды В.Катавіцкі. Кампазітар бывае тут часта, сустракаецца з месцічамі. А найперш — наведвае маці (бацька, які выкладаў у музычным вучылішчы і даў Алегу пуцёўку ў прафесію, на жаль, даўно пакінуў зямны свет).

Што ж А.Елісеенкаў прэзентаваў свайму дому і землякам (у самым шырокім — у маштабе краіны — сэнсе)? Яскравую песенную рэтраспектыву і зусім новыя творы (многія — плён супрацоўніцтва з А.Бадаком). Дар меладыста, грунтоўная акадэмічная адукацыя ў класе прафесара Д.Смольскага; майстэрства, дасведчанасць у справе, якой займаецца, — усё гэта ёсць. Таму і не дзіва, што зала ўспамінае колішнія шлягеры, падхоплівае прэм'еры, нібы ўжо знаёмыя матывы: пра музыкаў, якія "ігралі — і нібы душу спавядалі", пра матулін сум і вяртанне "блуднага сына", пра верабейку і прыгажуню—шэранькую мышку, пра заварожаную фею і сарамлівую дзяўчынку. Пра вайну-разлучніцу і "зямлі маёй песні, зямлі маёй памяць"... Песні гучалі ў выкананні юнай Вольгі Сацюк ды мэтра беларускай эстрады Анатоля Ярмоленкі, вакальнай групы "Чысты голас", дуэта Ядвігі Паплаўскай ды Аляксандра Ціхановіча, "незалежных" спевакоў Іны Афанасьевай, Аляксандра Саладухі (з ім пачынаў кампазітар шлях на эстрадзе) і ўдзельнікаў студыі "Гран-пры" Дзяржаўнага канцэртнага — Пятра Ялфімава, Ганны Мушак, і салістаў слыннага аркестра. Дарэчы, А.Елісеенкаў далучыўся да музыкантаў у якасці клавішніка. У выкананні аўтара прагучаў і шэраг песень.

V

Дзівосная і гераічная творчая істота — Дзяржаўны канцэртны аркестр, якім кіруе М.Фінберг! Мала хто звярнуў увагу, скажам, на такі факт. Камерны аркестр пад кіраўніцтвам Валерыя Сарокі, натхнёна правёўшы праграму з музыкі беларускіх класікаў, праз пару гадзін ужо граў аўтарскі канцэрт А.Елісеенкава — у якасці струннай групы вялікага сімфаджазавага калектыву. Зорнага калектыву, у якім свой голас маюць і гітарысты С.Анцішын, А.Каліноўскі, саксафаністы У.Ксёнц, П.Бяляўскі... Ды і жывому шчыраму выкананню вакалістаў трэба аддаць належнае! Ці даўно колішні мэр Маладзечна М.Чурсін уручаў ключы ад аўтамабіля ўладальніку гэтага галоўнага фестывальнага прыза — таленавітаму "несталічнаму" пачаткоўцу Дзмітрыю Качароўскаму? А сёння гэты спявак трымае на сабе ключавыя нумары ўсіх песенных праграм. І поруч з ім — вядомыя, па-свойму адметныя Н.Тамела, А.Яфімік, Т.Глазунова, Г.Грамовіч, Р.Мусвідас, Ю.Вашчук. Два багатыя, аксамітныя барытоны: заслужаны артыст Беларусі Мікалай Скорыкаў і малады "навабранец" з Украіны, лаўрэат леташняга "Славянскага базара" Васіль Лазаровіч. А які чысты, культурны ансамбль утвараюць бэк-вакалісты!

Між іншым, у М.Фінберга пыталіся пра конкурс маладых выканаўцаў, які рэгулярна ладзіўся калісьці ў межах маладзечанскага фэсту. Маэстра супраць адраджэння такога спаборніцтва: спяванне ў жывым тэлеэфіры пры няўстойлівым, а то й неспрыяльным надвор'і — вялікі стрэс для юных неспрактыкаваных канкурсантаў. Ні эстэтычнага задавальнення, ні годнага мастацкага выніку, па вялікім рахунку, тут чакаць не варта. А трэба зрабіць у Беларусі адзін сур'ёзны агульнанацыянальны конкурс эстрадных выканаўцаў, якім апекавалася б тэлерадыёкампанія: наладзіць жорсткі паслядоўны адбор лепшых з лепшых, а пераможцаў рыхтаваць потым да міжнародных конкурсаў.

VI

Фестываль завяршыўся, можна сказаць, на досвітку ўжо новага дня, падараваўшы гораду "Беларускую калекцыю" — праект Белтэлерадыёкампаніі. Калекцыю лепшых айчынных песень у абноўленым, свежым абліччы прадставілі ўсе лепшыя нашы эстрадныя выканаўцы: і "мэтры" жанру, і маладыя папулярныя салісты, і ансамблі...



Перагортваючы нататнік, з удзячнасцю засяроджваеш позірк на прозвішчах арганізатараў свята — прадстаўнікоў гарадской улады Н.Сідарэнкі, Я.Ідэльчыка, нядаўна прызначанага кіраўніка раёна С.Касабуцкага, кіраўніцтва Мінаблвыканкама, Міністэрства культуры.

Успамінаеш мноства кранальных штрыхоў: гасцінічны ліфт, які "размаўляў па-беларуску", нагадваючы пасажырам нумар паверха; букеты вечаровай ілюмінацыі ды фантастычныя кветкі феерверка, які абмінула, не праліўшы ні кроплі, навальнічная хмара. І вытанчана простае ўбранне фестывальнай сцэны: сіні лубін, карункі папараці, пухнатыя ружовыя "каласкі" з роснага мурогу... Нібы шчаслівыя дзеці, мы ў тыя дні забываліся на час, імкнучыся максімум пабачыць і пачуць, спрабавалі ахапіць неабдымнае. Але гэтага яшчэ нікому не ўдавалася.

А стрэлкі фестывальнага гадзінніка не спыняюцца. Да наступнага песенна-паэтычнага спаткання ў Маладзечне — дай Бог яму жыцця! — засталося ўжо крыху менш як два гады.

С.БЕРАСЦЕНЬ,
В.КАВАЛЁЎ (фота),
спецыяльныя карэспандэнты "ЛіМа"

Самая чорная нэндза навальваецца на сённяшніх феміністаў, бадай, тады, калі антыфеміністы, стаміўшыся ад стратных-такі для здароўя палемік, цішком уцякаюць на лецішчы ці пампезна выпраўляюцца "на воды". Адсутнасць на даляглядзе ворага (ці хаця б больш-менш прыстойнага апанента) спачатку радуе, пасля разнявольвае — і неўзабаве пачынае сур'ёзна трывожыць, бо няўмольна страчваецца з такой цяжкасцю набытая баявая форма. У гэткай скрусе будзеш радавацца нават мінаку, які выпадкова трапіў на аціхлае поле бітвы. А ўжо чалавек, што рушыў сюды свядома і, здаецца, ахвотна тут затрымаўся, мусіць быць грунтоўна ўшанаваны.

Анатоль Андрэеў і ў адносінах да "жаноцкасці" (як тыпу стасункаў з рэчаіснасцю), і ў дачыненні да "мужчынскасці" (як пазнаваўчай стратэгіі) аднолькава іранічны, але не бязлітасны. Парадаксалізм яго асобных вызначэнняў жывіцца, на мой погляд, не столькі рашучымі намерамі спасцігнуць-такі чалавечую прыроду, колькі цікаўнасцю: за што яго будуць крытыкаваць з найбольшаю асалодаю і што публіка будзе кваліфікаваць як найвялікшае злачынства супраць Жанчыны. Мне падаецца, што для сп. Андрэева больш прывабным выглядае шлях самурая, але не камікадзе. Зрэшты, чужая душа...

Ірына Шаўлякова

Статус-кво



Мы жывём у эпоху матрыярхату, у эпоху, дзе пануе культура жаночага (пачуццёва-псіхалагічнага, вобразнага, прыстасавальнага) тыпу. Іншы тып адносін стварыў бы іншы духоўны космас, іншы тып культуры — мужчынскі, дзе розуму не стала б больш, але яго функцыі ў стасунках са светам усведамляліся б як галоўныя, прыярытэтныя. Павелічэнне мужчынскага, такім чынам, не азначае змяншэння жаночага. Колькасна мужчынскі складнік проста не можа пераважыць жаночы. Бо ў адваротным выпадку парушаюцца ўсе законы космасу — і сістэме, арганічнай сістэме, пагражае самаліквідацыя.

У сучаснай культуры ўтрымліваецца правобраз будучай. Намінальная і колькасная перавага мужчын у сферах навукі, палітыкі, мастацкай і рэлігійнай культуры не павінна падманваць: усе гэтыя мускулістыя хлопцы шчыруюць на карысць матрыярхату.

Колькасць мужчын павінна перайсці ў новую якасць адносін да сябе, да соцыуму і прыроды. Прагрэс — гэта іншая якасць, забяспечаная колькаснымі зменамі. У сферы грамадскіх адносін людзі павінны развучыцца крыўдаваць, помсціць, скардзіцца Маці Боскай, беспадстаўна імкнуцца быць першымі — словам, павінны перастаць быць жанчынамі.

Тады можа ўсталявацца эпоха патрыярхату.

* * *

Каторыя якасці з'яўляюцца сапраўды жаночымі, якія — надумана жаночымі, якія — звычайная даніна модзе? Ці: што ёсць сутнасцю жаноцкасці?

Можна гэтыя пытанні абвясціць вечнай загадкай альбо лічыць адказы на іх самадастатковымі. Так ці іначай усе разумеюць: пытанні простыя і разам з тым каварныя. Адна справа абмяркоўваць іх у ток-шоу, і зусім іншая — разабрацца ў іх сур'ёзна.

Паспрабуем метадалагічна граматна падысці да праблемы. Каб правільна адказаць на пытанне, трэба яго правільна фармуляваць, суадносіць з пэўнай сістэмай філасофска-светапоглядных каардынат. Натуральна, на ўзроўні эмпірыкі ўсё проста: жанчына павінна валодаць жаноцкасцю. Гэта яшчэ не адказ на пытанне, але ўсё ж пазначэнне нейкай рэальнай семантычнай апазіцыі: жанчына не павінна быць мужчынам, жанчына мусіць яму супрацьпастаўляцца.

А што за якасці ёсць супрацьлеглымі мужчынскім? Тут ужо важна дакладна вызначыцца з сутнасцю мужчынскасці.

Такім чынам, адразу ж высвятляецца, што "жаночае пытанне" не лакальнае і аўтаномнае; яно ўяўляе сабой водгулле нейкай універсальнай, сусветнай праблемы. Надзвычай складана прымацавацца да больш-менш аб'ектыўнай сістэмы каардынат. Становіцца відавочна, што прынцып "колькі галоваў, столькі і розумаў" тут не спрацоўвае. Справа не ў чыімсьці меркаванні; справа ва універсалізме канцэпцыі.

З пункту гледжання той духоўнасці, чыя сутнасць структураваная ў абмежжы культурных палюсоў "псіхікі і свядомасці", родавай уласцівасцю мужчыны з'яўляецца не сіла, грубасць, жорсткасць, прадпрымальнасць, ініцыятыўнасць, устаноўка на лідэрства (біялагічна абумоўленыя, відавочныя, знешне красамоўныя прыметы мужчынскасці) — але здольнасць будаваць свае адносіны са светам (у тым ліку і са светам жанчын) "ад розуму". Мужчына ў адпаведнасці са сваёй галоўнай, вызначальнай культурнай функцыяй (духоўна-інфармацыйная дэтэрмінацыя) — гэта той, хто спасцігае свет, асвойвае канцэптуальна, адлюстроўвае яго, арыентуючыся на аб'ектыўныя дадзеныя пра любую кропку Сусвету — ці то астэроід, ці то чарапаху, ці то загадкавую жаночую душу.

Калі гэта так, дык сутнасць жаноцкасці (у пэўным сэнсе —антымужчынскасці) праяўляецца перш за ўсё не ў мяккасці, падатлівасці, неагрэсіўнасці ды іншых знешніх жаночых атрыбутах, а ў дзіўнай, з пункту гледжання мужчыны, здольнасці прыстасоўвацца да свету, жыць у прапанаваных умовах, атачаць сябе "рэчамі" — і не пакутаваць над праблемаю іх прыроды. Жанчыны — геніі ўмення проста жыць. Галоўнае жаночае пытанне не "ў чым сэнс?" ці "чаму?", а "хто вінаваты?" і "што рабіць?". Менавіта так: гэтыя сфармуляваныя мужчынамі пытанні — тыпова жаночыя. "Жаноцкасць" у культурным сэнсе — гэта ўжо не якасць ці ўласцівасць полу, але характарыстыка тыпу адносін да рэальнасці. Многа, надзвычай многа вусатых і барадатых, і нават разумных, вельмі разумных мужчын на самай справе аказваюцца жанчынамі, што жанчын, натуральна, бянтэжыць. Пачынае працаваць міфічная шкала: яны мацнейшыя, а мы слабейшыя; яны таўстаскурыя — а мы датклівыя і г.д. Гэта і ёсць тыпова жаночая дыферэнцыяцыя і класіфікацыя: не паводле родавай, а паводле знешняй прыметы. А ўжо знешніх адрозненняў вострым жаночым вокам можна адшукаць тысячы. Пры гэтым неяк само сабой будзе атрымлівацца, што ўсе параўнанні — не на карысць грубых і нячулых мужчын. Зрэшты, тое дэталі...

Прырода жаноцкасці заключаецца ў той функцыі, што вынікае з якасці "псіхічнасць", а менавіта ў здольнасці прыстасоўвацца да свету, але не спасцігаць яго. Мяккасць, пяшчотнасць і інш. — гэта наступствы, але не прычыны. Прырода мужчынскасці вынікае з феномена "свядомаснасці", а знешняя агрэсіўнасілавая фактура можа выступаць як формаю жаноцкасці, так і формаю нежадання прыстасоўвацца. Больш за тое: сапраўдныя мужчыны — мяккія па сутнасці, бо філасофія, квінтэсенцыя свядомых адносін, менш за ўсё нагадвае дубінку, таран ці ракету класа "зямля—паветра". Сіла і напорыстасць — дэвіз бессвядомых прыстасаванцаў. Бо якраз сіла і была заўсёды асноўным спосабам прыставання.

Ці варта пасля ўсяго гаварыць, што жанчына кіруе светам? Кіравала — і кіруе. Але вінаватыя ў катастрофе, да якой непазбежна прывядзе жаночы стыль мыслення, будуць мужчыны. І не толькі таму, што іх колькасна больш ля стырна соцыуму. Яны будуць вінаватыя таму, што былі залішне добрымі, узорнымі жанчынамі.

З філасофскага, г.зн. з мужчынскага пункту гледжання міжнародны жаночы дзень — гэта свята са слязьмі на вачах. Што святкуем? Зрэшты, усе святы такія, бо заснаваныя жанчынамі (у шырокім сэнсе). Бясспрэчна, мужчына павінен шанаваць у сабе жанчыну: змагацца з сабой, з уласнай прыродай — неразумна, недарэчна. Аднак не пытайцеся ў жанчын, у чым сутнасць жаноцкасці. Вы імгненна станецеся непаўнавартасным — таму што вы мужчына, а жанчынам, сапраўдным жанчынам немагчыма растлумачыць, хто яны такія. Яны не ўмеюць глядзецца ў люстра розуму. Ім падавай люстра душы.

Дыялектыка называецца. Мужчыны мусяць гэта перажыць.

* * *

Жанчына — істота цалкам прыродная. Аднак рэалізуецца яе сутнасць у двух варыянтах, што часам прыводзіць да непаразуменняў.

Першы варыянт. Жанчына, істота глыбока сацыяльная (то бок схільная да гуртавання і не схільная да адасаблення, што так уласціва для асобы), і ў сям'і (ячэйцы грамадства) становіцца ўзорам грамадска карысных паводзін, меркаю маралі. Такая жонка — эталон дабрачыннасці, самы неўтаймоўны апалагет усяго сацыяльнага, што гераічна выконвае грамадскія функцыі на акрэсленым участку фронту.

Можна запярэчыць: пры чым тут прыродны пачатак?

Пры тым, што сацыяльна абумоўленыя паводзіны — шмат у чым бессвядомыя паводзіны, мэта і звышзадача якіх — працяг і захаванне ячэйкі, роду і папуляцыі. І гэта надзвычай важная функцыя, пра што спрачацца. Ідэал жанчыны ўсіх часоў і народаў звязваюць найперш з эфектыўным выкананнем гэтай функцыі. Я вас люблю, к чему лукавить; но я другому отдана, я буду век ему верна. Чаму застаецца вернаю Таццяна Ларына (лар, ларец, куфэрак дабрачыннасці)? Нормам "звычаёвай" маралі, нават калі (а тым больш калі) яны супярэчаць яе асабістым інтарэсам. Ларына прадэманстравала подзвіг самаахвярнасці, любімы і вечны сюжэт соцыуму. (Мастацтва ў той ступені, у якой выражае грамадскае бессвядомае, наўпрост абслугоўвае інтарэсы соцыуму.) Сацыяльны інстынкт, угрунтаваны ў патрэбе працягу роду, у Таццяне стаўся мацнейшым за інстынкт полу, інстынкт адасобленай асобіны. У Анегіна, заўважым, усё было якраз наадварот. Што і спарадзіла канфлікт.

Другі варыянт. Існуюць жанчыны, якіх мараль, нават элементарныя нормы грамадскай прыстойнасці нібыта абцяжарваюць. Іх, натуральна, не назавеш асацыяльнымі, аднак інстынкт полу ў іх мацней за інстынкт працягу жыцця. Задавальненне эратычнага кшталту яны ставяць вышэй за задавальненне быць жонкай. Пачуццёвыя, гуллівыя, легкадумныя — яны прыцягваюць увагу, але не цягнуць на ідэал. Мужчыны з задавальненнем бяруцца шлюбам з першымі, каб усё жыццё пакутаваць ад сораму, што іх вабяць другія.

Недарэчна ставіць пытанне, хто лепш — першыя ці другія. Перад намі два абліччы аднаго бога. Іх пол такі.

* * *

Жанчына фарміруецца ў полі інстынктаў. Калі камусьці падаецца, што гэта жорсткая крытыка, зрыванне масак, вэлюму ды іншых адпаведных полу строяў, — ён памыляецца. Зрываць і крытыкаваць — тыпова жаночы стыль "пазнання", какецтва пад суровай маскай. Мяне ж цікавіць спасціжэнне чалавечай прыроды. Жанчына — таксама чалавек, але яна істота цалкам прыродная — і г.д.

Анатоль АНДРЭЕЎ

Анатоль ЗЭКАЎ

Крумкач і чайка

Развагі пакідаю крумкачу
І чайкай белай да цябе лячу.

Ніна ЗАГАРЭЎСКАЯ

Больш разважаць ні грама не хачу
І думаць не жадаю — хоць ты плач.
Развагі пакідаю крумкачу,
Хай разважае й думае крумкач.

А я ўзнімуся чайкай на крыло
І палячу, пакуль імпэт не счах,
Каб трапіць назаўжды ў тваё сіло
І не вярнуцца больш да крумкача.

Грэшнікі

Стаю прад табою я, грэшны,
Такі ж мо, як грэшная ты?

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

Усё ў мяне так, як належыць,
Ды кошкі шкрабуць на душы.

Даўно адчуваю, што грэшны,
І ведаю, з кім я грашыў.

Грашыў я з табою, малодкай,
І як ні прыкідвайся, ды
Я грэшны, напэўна, усё-ткі
Не болей, чым грэшная ты.

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Няма ліха без дабра

Мілай я не сказаў лепшых слоў.
Аказаўся не лепшым... Разява.
Хтосьці лепшы каханую звёў.

Міхась Башлакоў

Мілай я не прызнаўся ў каханні,
Не сказаў самых вартасных слоў.
Прамарудзіў я з імі ў чаканні
Больш выгодных і зручных часоў.

Думаў, перш пабудую святліцу,
Потым неяк прыдбаю "Жыгуль".
Рыхтаваўся, чакаў — у сталіцу
Не зманілі дзяўчыну пакуль.

Прыкацію у пасёлак
на "Фордзе"
Па яе нейкі зух-кавалер,
І жыву я ў нудзе
і ў трывозе
Найняшчасны,
напэўна, цяпер.

Вось такая балючая справа.
То маўчаў,
то ад гора крычу:
— Небарака! Бамбіза!
Разява! —
Сам сябе дакараю, хвашчу.

Ды пішу яшчэ вершы пра гэта,
Выліваю самоту, бяду.
Можа,
стану багатым паэтам —
Не такую красуню знайду.



Янусь МАЛЕЦ

Вось дык падаруначак!

Моўчкі прад табою стану на калені
І ў твае далоні сэрца пакладу.

Змітрок МАРОЗАЎ

Моўчкі прад каханкай
стаў я на калені,
Вершаваны маналог
пачаў чытаць,
Выцягнуў руку наперад,
быццам Ленін,
Перад тым, як Зімні,
ці яшчэ штось браць.

Потым хутка скінуў апранаху,
Сэрца раптам выняў: — На! Дару!
І каханка, хоць на выгляд —
чарапаха,
Ірванула ад мяне, як кенгуру!



Мікола ВЯРШЫНІН

Скараціў... сам сябе

(эпіграма)

Пісаў надзіва доўга перш,
За што крытыкавалі.
Ён скарачаць стаў кожны верш —
Яго ўжо друкавалі.

Найкарацей!
І прынцып той
Стаў рысаю натуры.
Не браўся болей ні за што,
Пісаў мініяцюры.

Пасля стаў падыход такі
Законам для паэта:
Ён піша вершы ў два радкі —
Ну, што ж,
няблага й гэта.

Тады пайшоў яшчэ далей:
Пісаў ён загаловак,
Ды хоць бы што яшчэ, але...
Шматкроп'е —
і ні слова.

Нашто, падумаў ён затым,
Пакуты, пераробкі?
Шчэ скараціўся.
Скончыў тым,
Што піша толькі...
кропкі.

Сатырычныя мініяцюры

Звышпадхалімаж

Даклад начальнік скончыў і пытае:
— Магчыма,
думку іншую хто мае?
Вось вы,
скажыце шчыра пры народзе!
— Так, маю,
толькі з ёю я не згодзен.

Звышпрынцыповасць

Быў шлюб, збіраліся вяселле справіць:
Нявеста — ў маі, а жаніх —
у чэрвені.
І так сур'ёзна падышлі да справы,
Што разышліся — не сышліся
ў тэрміне.

Перастрахоўшчык

Быў асцярожны ўсім надзіва,
Усюды вытрымкай хваліўся.
Заўжды па нітачцы хадзіў ён,
Але нарэшце ўсё ж... зваліўся.

Звычка злодзея

Балюча бачыць
без нагляду рэчы,
Мне іх шкада зусім па-чалавечы.
Я ж рупны,
я знайду ім прымяненне:
Ім будзе ўтульней у маёй кішэні.

Малюнкі Алега КАРПОВІЧА

Міхась Уласенка

Дробязі жыцця

* * *

Даволі
Слоўных фокусаў —
Жанчына
Прагне доказаў!

* * *

У стане творчай грамады
Найбольш вялікіх атакуюць;
Пустое месца, пэўна, ты,
Калі цябе не крытыкуюць.

* * *

Вынаходцы,
Прыміце віншаванне —
Пазбавілі вы нас
Жыццёвай драмы:
Дыстанцыйны пульцік
Кіравання —
Цудоўны сродак
Ад тэлерэкламы!

* * *

Малады ён і гладкі,
Толькі норавам гадкі.

* * *

Любоў сляпая? Быў і мне урок:
Ажаніўся — і вярнуўся зрок.

* * *

Мастак-араты,
Генерал калёс...
Ён узарэ надзел ваш,
Вып'е нанач;
Узімку ён для дачнікаў —
"Булдос",
А летам ён для іх —
Іван Сцяпаныч.

* * *

Верце мне, ці не верце —
Дам параду дарма:
У справу ўкладвайце сэрца —
Калі грошай няма!

Мікола ШАБОВІЧ

Лазінка, не гніся!

Я цябе
Да ранку слухаў,
Гнуткую
Сваю лазінку.

Кастусь ЖУК

Хоць я сёння і пад мухай,
А "Стаяць!" — крычу, — лазінка!
Я цябе да ранку слухаў,
Ты ж паслухай хоць хвілінку.

Стань хаця б на міг нягнуткай,
Выканай маё жаданне,
Бо інакш збяжыш нячутна,
Можа — Ева, можа,
Ганна...

А яна не хоча слухаць
(Не лазінка — проста гора!):
"Калі прыйдзеш не пад мухай,
Вось тады і пагаворым..."



Сёння ўзнікаюць цяжкасці адносна правапісу, якія, напэўна, хвалююць не толькі навукоўцаў-спецыялістаў, але і пісьменнікаў, журналістаў, настаўнікаў і, асабліва, школьнікаў, якія рыхтуюцца да экзаменацыйных іспытаў. Вось адна з цяжкасцяў: як пісаць тое ці іншае слова замежнага паходжання?

«Лідэр» ці «лідар»?



Запазычанні, як вядома, гэта словы, якія перайшлі з адной мовы ў іншую ў выніку міжмоўнага ўзаемадзеяння. Яны бываюць розныя па ступені асіміляванасці: асвоеныя часткова ці цалкам. Цалкам асвоеныя, яны нічым не выдаюць сябе, поўнасцю прыжыліся ў беларускай мове, іх фанетыка-марфалагічнае афармленне і семантыка не адрозніваецца ад спрадвечна беларускіх слоў. Вось прыклады такіх запазычанняў – салата, праца, сталяр, блакітны. Часткова ж асвоенымі словамі часцей за ўсё бываюць экзатызмы. Яны называюць прадметы і паняцці, якія характэрныя культуры іншых народаў. Напрыклад, лэдзі, пенс, лейбарыст, злоты, бундэстаг...

Цяпер іншамоўная лексіка часцей за ўсё трапляе ў беларускую мову праз рускую. Такім шляхам у пачатку XX стагоддзя наша мова папоўнілася шматлікімі англійскімі словамі: бізнес, блакнот, джэм, докер, кекс, лідэр, ліфт, фініш... Узнікае праблема напісання іншамоўных слоў, варыянтнасці ў іх правапісе. Хацелася б разгледзець яе на прыкладзе слова лідэр.

Зазірнём у "Слоўнік іншамоўных слоў" (1999) А. М. Булыкі. Слова "лідэр" паходзіць ад англійскага "leader", што значыць – вядучы, кіраўнік. Абазначае: 1) кіраўнік палітычнай партыі, грамадска-палітычнай арганізацыі; 2) той, хто ідзе першым у спартыўным спаборніцтве; 3) вядучы карабель у караване суднаў. Існуе варыянтнасць напісання гэтага слова, і пра гэта яскрава сведчыць практыка сучасных СМІ. Напрыклад, газета "Звязда" ў сваіх матэрыялах прытрымліваецца напісання "лідар". Чым можна растлумачыць варыянт правапісу гэтага слова? Здаецца, звяздоўцы разглядаюць слова "лідар" як цалкам асіміляванае, якое адаптавалася ў беларускай мове.

Беларускія слоўнікі падаюць гэтае слова як асіміляванае толькі часткова, таму яно захоўвае свой правапіс і гучанне, якія перадаліся з англійскай мовы: leader [л і д э р]. Тым больш, гэтае слова – інтэрнацыянальнае. Гэта значыць, мае падобныя формы не менш чым у чатырох народнасных мовах.

Што ж адбудзецца, калі звычайны школьнік у дыктоўцы ці ў сачыненні напіша замест "лідэр" – "лідар"? У такім выпадку вучань можа апынуцца ў даволі складанай сітуацыі. Бо ўсе ведаюць, што пры разыходжанні ў напісанні пэўных слоў перавага аддаецца акадэмічным і салідным даведачным выданням (гл. "Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы" пад рэд. Б. А. Плотнікава і В. П. Трайкоўскай, 2004).

Ці трэба прыспешваць падзеі і пазначаць, што напісанне таго ці іншага слова — гэта "выбар рэдакцыі"? Тым больш у выданнях, якія ідуць у школу, да настаўнікаў і вучняў. Думаецца, найперш трэба апеляваць да Акадэміі навук, дзе і вызначаюцца нормы сучаснага правапісу. Неабходна, каб навукоўцы прызналі гэтае слова цалкам асіміляваным і занатавалі напісанне праз -а ў нарматыўных слоўніках. Бо на сёння яно падпала пад такую фанетычную з'яву, як аканне. Літары -о, -э пішуцца ў беларускай мове толькі пад націскам.

Спрэчныя выпадкі, безумоўна, вымагаюць супольнага абмеркавання ды навуковага абгрунтавання. І гэта патрэбна дзеля таго, каб унармаваная сучасная беларуская мова была надзейным вербальна-выяўленчым сродкам. Часам дыскусійнасць таго ці іншага пытання можа выглядаць на першы погляд надуманай, нават штучнай. Хтосьці пачне даводзіць, што трэба найперш арыентавацца выключна на маўленчую практыку. Аднак правапіс — гэта не рух без правіл, а паказчык сталасці культуры грамадства. Невыпадкова ў такіх краінах, як Францыя, за парушэнне моўных норм на газету, часопіс ці рэкламнае агенцтва могуць накласці штраф. Таму і дыктар сочыць за вымаўленнем, і рэдактары пільныя. Экстралінгвістычныя тэндэнцыі акурат і павінен зафіксаваць новы законапраект аб зменах правапісу, які на сёння падрыхтаваны ў Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі і актыўна рэцэнзуецца. Галоўнае, у чым асабліва і пераконваць не трэба, наша сучасная літаратурная мова пастаянна развіваецца, удасканальваецца, узбагачаецца. Пісьменнік і мовазнаўца Кандрат Крапіва абсалютна слушна гаварыў пра дасканаласць граматычнага ладу беларускай мовы, што "дае магчымасць пабудаваць любую фразу, выказаць любую думку". І яшчэ: вельмі важна, каб беларускае слова не раз'ядноўвала, а гуртавала, дапамагала чалавеку ў духоўным і практычным жыцці, каб у ім мелі патрэбу.

Яўген БЕЛЬСКІ,
студэнт факультэта журналістыкі БДУ

Фотакалаж Віктара КАВАЛЁВА

Друкаваныя сведкі вайны

У чытальнай зале аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася прэзентацыя факсімільнага выдання. Яно складаецца з падпольных і партызанскіх газет, часопісаў, плакатаў ды лістовак перыяду Вялікай Айчыннай вайны 1941 — 1945 гадоў і мае назоў "І паўстаў народ..." (Мн., 2005, выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі).

Укладальнікамі выдання з'яўляюцца загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі А.Стэфановіч і намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя" В.Рабкоў. Аўтары прадмоў — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ, пісьменнік Алесь Савіцкі і навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі А.Дзенісенка, а бібліяграфічны паказальнік падрыхтаваны малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў В.Губанавай.

"І паўстаў народ..." — унікальны збор дакументальных матэрыялаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Ён змяшчае шматлікія падпольныя і партызанскія выданні ад рэспубліканскіх, абласных, раённых газет — да насценных лісткоў і маладзёжных антыфашысцкіх бюлетэняў. Амаль усе яны, "байцы друкаванага слова", ацалелі ў тых вогненных, гераічных днях у адзінкавых экземплярах і сёння захоўваюцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Побач з насценнымі газетамі вялікага фармату ў партызанскіх атрадах і падраздзяленнях выходзілі баявыя лісткі, якія, як правіла, былі меншымі па памерах, але па сваім баявым ідэйным змесце і добрым афармленні адказвалі на тыя ж пытанні і служылі таму ж прызначэнню, што і насценныя газеты.

Багатая калекцыя падпольнага перыядычнага друку ваеннага часу, што была выкарыстана пры падрыхтоўцы гэтага выдання, пачала фарміравацца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі з 70-х гадоў XX стагоддзя. Часткова гэтыя матэрыялы былі атрыманы ў дар бібліятэкай ад акадэміка АН Беларусі К.Крапівы, акадэміка АН Беларусі І.Краўчанкі, ваеннага журналіста В.Стальнова, а таксама знаходзіліся ў калекцыі П.Панамарэнкі.

"І паўстаў народ..." — помнік нашай гісторыі, жывое слова тых векапомных дзён. Выданне будзе карысным для даследчыкаў, выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх устаноў, студэнтаў, навучэнцаў, для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй.

Алесь САЧАНКА
Фота В. КАВАЛЁВА

Ніхто не забыты?

Штотыднёвік "ЛіМ" у № 12 пісаў аб праведзенай у мінскай гімназіі №5 рабоце "па вывучэнні баявога шляху адзінага ў свеце 46-га гвардзейскага авіяпалка". Але падобных падраздзяленняў у СССР было тры. Гэта ўдакладненне я не паспеў давесці да ведама чытачоў "ЛіМа" напярэдадні 60-годдзя Перамогі ў Вялікай айчыннай вайне, таму хачу зрабіць яго ў сувязі з 61-ай гадавінай вызвалення нашай краіны ад фашысцкіх захопнікаў.

Адкрываем т.9 БелСЭ (Мн., 1973, с.118): "Раскова Марына... Герой Савецкага Саюза (1938)... У Айчынную вайну арганізатар жаночых авіяпалкоў: 586-га знішчальнага, 46-га гвардзейскага бамбардзіровачнага Таманскага, 125-га гвардзейскага бамбардзіровачнага Барысаўскага". Раскова праславілася яшчэ перад вайною далёкімі беспасадачнымі пералётамі з Верай Ламакай, Валянцінай Грызадубавай і Палінай Асіпенкай. Яны сваім пачынам, сваімі подзвігамі выклікалі масавы прыток савецкіх дзяўчат у аэраклубы, наогул, у авіяцыю, што і дазволіла стварыць жаночыя авіяпалкі. І вось артыкул аб такім выдатным ва ўсіх адносінах чалавеку выкінулі з БелЭн, якая фактычна з'яўляецца 2-м выданнем БелСЭ. Не дзіўна, што пры такіх адносінах мала хто ведае пра Марыну Раскову і жаночыя авіяпалкі.

Між тым, 125-ы полк пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў, якім і камандавала гераічная жанчына, пасля яе гібелі ў 1943 годзе стаў "імя Героя Савецкага Саюза М. М. Расковай", а ў 44-м за ўдзел у аперацыі "Баграціён" пры вызваленні Барысава атрымаў да ўсяго ганаровую назву "Барысаўскі". Яму, як і 46-му палку начных бамбардзіроўшчыкаў (з прыкладна 30 жанчын-авіятараў, якія атрымалі за Вялікую айчынную Залатыя Зоркі, больш 20 — з двух гэтых палкоў), патрэбна было прысвяціць у энцыклапедыі асобныя артыкулы, як зрабілі ў адносінах да авіяпалка "Нармандыя-Нёман". Замест гэтага са старонак БелЭн убралі нават успамін аб 125-м палку.

У БелСЭ ёсць і персаналія — з партрэтам — галоўнага маршала авіяцыі Канстанціна Вяршыніна, камандуючага 4-й паветранай арміяй, у склад якой уваходзілі два палкі — 46-ы (маецца і здымак генерал-палкоўніка Вяршыніна ў акружэнні "начных ведзьм" — менавіта так называлі лётчыц немцы) і "Нармандыя-Нёман". Прынамсі, 4-я армія праявіла сябе ў аперацыі "Баграціён", а К. А. Вяршынін у жніўні 44-га стаў Героем Савецкага Саюза. Але з БелЭн яго таксама выкінулі, хаця ён ваяваў у Беларусі яшчэ ў грамадзянскую і 15 гадоў быў галоўнакамандуючым ваенна-паветраных сіл Беларусі.

У БелСЭ далі персаналіі ўсіх устаноўленых на той час Герояў Савецкага Саюза — беларусаў, ураджэнцаў нашай краіны, іншых герояў, здзейсніўшых подзвіг на беларускай зямлі. Гэтага прыпцыпу прытрымліваліся і ў БелЭн, але з незразумелымі і даволі частымі выключэннямі. Так, знялі артыкулы аб лётчыках-беларусах, Героях Савецкага Саюза Антоне і Яўгену Аляхновічах. Ёсць у БелСЭ і артыкул, з партрэтам, аб Героі Савецкага Саюза Дзмітрыі Мядзведзеве, "удзельніку партызанскага руху ў Беларусі" (т. 7), аўтару атрымаўшай сусветную вядомасць кнігі "Моцныя духам" — аб атрадзе "Пераможцы" і легендарным разведчыку Мікалаі Кузняцове. Першы атрад Мядзведзева дзейнічаў на Магілёўшчыне і ў Бранскіх лясах, пускаў пад адхон эшалоны, узрываў чыгуначныя масты, граміў нямецкія гарнізоны... Другі —"Пераможцы" — пачынаў таксама на яго радзіме — у Беларусі. Адсюль, а дакладней з Мазырскага Палесся, партызаны накіраваліся ў бок "нямецкай сталіцы" Украіны — горада Роўна і стаўкі Гітлера пад Вінніцай. Але хтосьці, лічу, не вельмі думаючы, выдаліў і Мядзведзева з БелЭн. Дарэчы, у БелСЭ напісана, што ён нарадзіўся ў Арлоўскай губерні, але гэта памылка, якую паўтараюць і іншыя даведнікі.

Сам Мядзведзеў, расказваючы, як ён заблудзіўся ў мазырскіх лясах, піша: "Наступілі прыцемкі, і я зразумеў, што канчаткова збіўся з дарогі. Хаця нядрэнна арыентуюся ў лесе. Нарадзіўся я ў Беларусі, у дзяцінстве часта хадзіў па грыбы, па ягады, з юнацтва прыхвоціўся да паляўніцтва". У БелЭн яўна паспяшылі пазбавіцца ад земляка. Праўда, ніводная вядомая мне кніга не называе гэтага легендарнага чалавека ўраджэнцам Беларусі. І тым не менш яно так! З якога ж кутка нашай зямлі ён родам? Вось загадка!.. Так, паспяшаліся ў БелЭн, паспяшаліся...

Уладзімір ЗЕЛЯНКОЎ

«Нават шэпт травы запаланіў душу...»



25 чэрвеня спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі. Ён нарадзіўся ў невялікай вёсцы Пуцілкавічы Барысаўскага павета Мінскай губерні расійскай імперыі (пазней — Ушачскі раён Віцебскай вобласці, БССР) у сялянскай сям'і. То быў час эканамічнага росквіту дзяржавы; асноўныя грамадзяне вялікай краіны — сяляне — мелі не толькі шматдзетныя сем'і, але ладныя кавалкі зямлі і трывалы дабрабыт. У сваёй «Аўтабіяграфіі» Пятрусь Броўка (сапр. *Пётр Усцінавіч Броўка*) пісаў, што ў сям'і іх, дзяцей, было дзевяць, а зямлі, каб пракарміць усіх, — 2,5 дзесяціны (амаль 3 гектары, — і гэта вам не 4 для ўсіх ураўняных савецкіх соткі). Да таго ж бацька быў добрым майстрам: вырабляў шафы, куфры ды скрыні, што давала някепскі дадатковы прыбытак. Пазней, прыхоўваючы свой боль па тым шчаслівым часе, пісьменнік згадае, як часта замаўляліся куфры вяскоўцамі ды прыезджымі сялянамі, як пасля кожнай пакупкі ладзілі бацькі багаты стол. Варта нагадаць, што ў куфры збіралі рэчы, у іх захоўвалі спадчыну, з ім жа, наладкаваным розным дабром, дзяўчат аддавалі замуж. І, зразумела, што ў шматдзетных сем'ях (на пачатку XX ст., у сярэднім па 10—11 дзяцей) было многа дзявок...

Пазней, за савецкім часам, як адну з форм прыгнёту, нам падавалі цяжкае дзяцінства сялянскіх дзяцей. Пры гэтым распавядалася і пра тое, што дзецям даводзілася пасвіць гусей, кароў, коней, працаваць у полі. Аднак, падобная праца цалкам натуральная для людзей, якія дбаюць пра свой уласны дабрабыт і пра дабрабыт сваёй дзяржавы; інакш проста не бывае, — гультай нічога не даб'ецца ў жыцці... «Нялёгка было, часам хацелася пагуляць з аднагодкамі, а даводзілася сачыць за статкам, але колькі было ў гэтым мілавання! Дагэтуль не забыцца на бясконцыя сцяжынкі на лугах і палях вакол роднай вёскі, задумлівага шэпту хваёвага лесу, парослых астравоў сярод бяздоння адвечных балот. Шматталоссе птушак, павевы ветру, пошум яловых галін, нават шэпт травы назаўсёды запаланілі душу», — прызнаваўся пісьменнік. Праўда, ягонае сталенне прыйшлося на той час, калі патрабавалі ўсё, што адбывалася «за царскім часам», толькі ахайваць, прыніжаць. З таго і не згадвае ў сваёй «Аўтабіяграфіі» Пятрусь Броўка, што, як і ўсе сялянскія дзеці, наведваў школу (статыстыка сведчыць: на пачатку XX ст. амаль 80 працэнтаў насельніцтва імперыі былі адукаваныя). Аднак, усё-ткі дае гэта чытачу зразумець... зрэшты, прывядзём кароткую цытату: «Дзевяць гадоў мне было, як пачалася Першая сусветная вайна. Назаўжды засталіся ў памяці сумныя жніўныя спевы адзінокіх салдатак, на плечы якіх нечакана леглі ўсе клопаты пра сям'ю. Упершыню мне тады спатрэбілася грамата. Я ўжо ўмеў чытаць і пісаць...» Гэтае ж уменне спатрэбіцца 13-гадоваму Петрусю, калі ў 1918 годзе, каб сям'я не папухла з голаду пасля рэвалюцыі, яму давядзецца пайсці працаваць у Вяліка-Долецкі валасны ваенны камісарыят. Да 1917 года дзяцей такога ўзросту, згодна існуючых законаў, на працу не бралі; ды і гаспадар сям'і, маючы сталы заробак, мог лёгка ўтрымліваць шматлікіх сямейнікаў (пры тым, што жонкі звычайна займаліся толькі хатнімі справамі).

Новая ўлада, перакруціўшы ўсё на свой капыл, — чаго ўжо тут хавацца, — прымушала сваіх першых савецкіх пісьменнікаў адкрыта хлусіць, прыдумляць тое, што з цягам часу нашчадкі пачалі ўспрымаць як праўдзівае мінулае. Не пазбег гэтага і Пятрусь Броўка (інакш проста б не стаўся пісьменнікам). Калі ішла Першая сусветная, яму было толькі дзевяць, аднак у сталым узросце ён раптам «прыгадвае», што «ішла цяжкая вайна, сяляне ляжалі ў акопах, галоднымі і абарванымі жылі іх сем'і, а панскія сынкі, атрымаўшы белыя білеты, раз'язджалі на тройках і, п'яныя, гарлапанілі разгульныя песьні, — для іх вайны не было». Магчыма, хлопчык не мог ведаць, што тады ў расійскай імперыі існаваў усеагульны воінскі абавязак, незалежна ад саслоўяў (!), і ніякіх белых білетаў «па блаце» проста не існавала. Аднак ён выдатна ведаў, што да 1917 года ў краіне ні адна сялянская сям'я не галадала; хаця б таму, што мела свой уласны зямельны надзел, а ў выпадку смерці гаспадара падчас вайны, сям'я атрымлівала немалую грашовую кампенсацыю. Сістэма сацыяльнай дапамогі была адладжана бліскуча, — што адзначалі і замежнікі, якія адпісвалі карэспандэнцыі ў розныя газеты, і пісьменнікі, якія вольна вандравалі па прасторах імперыі.

Пасля працы ў ваенным камісарыяце юнак перайшоў у валвыканкам (была прыдумана такая ўстанова: валасны выканкам), працаваў справаводам. І шмат чытаў: кніг, газет, розных пастаноў, загадаў, пратаколаў з сялянскіх сходак. Дарэчы, можна адзначыць, што выбар кніг на той час быў не проста малы, а... звышмізэрны. А ўсё таму, што новая ўлада канфіскавала ўсе (!) кнігі з кнігарняў, бібліятэк і народных дамоў, створаных яшчэ ў XIX— на пачатку XX ст. Былі забраныя і творы А. С. Пушкіна, не кажучы ўжо пра астатніх, нават танныя танюткія кніжачкі з серыі «Народная бібліятэка», якую да 1917 года выдавалі спецыяльна для сялян. Праўда, творы некаторых пісьменнікаў, якім новая ўлада «дазволіла» застацца ў савецкай літаратуры, з цягам часу вярталіся да чытачоў. Паціху «саспявалі» і свае кадры...

Не атрымаўшы ніякай спецыяльнай адукацыі, Пятрусь пачаў працаваць на адказнай пасадзе, — рахункаводам у саўгасах Вялікія і Малыя Дольцы. А ў вольны час удзельнічаў у самадзейнасці, наведваў драмгурток, дзе ставіліся розныя новыя інсцэніроўкі. Кшталту, «Песня пра сокала» і «Песня пра буравесніка», «Містэрыя вызваленай працы», «Дзейства аб Трэцім Інтэрнацыянале», «Пантаміма Вялікай рэвалюцыі», «Містэрыя-буф пра дурня-папа» і да т.п. Усе падобныя пастаноўкі ўздзейнічалі на чалавечы розум адпаведна іх зместу і мастацкай «каштоўнасці» тэкстаў... Неўзабаве П. Броўка сам стаў дасылаць у савецкую прэсу свае артыкулы пра новы сялянскі быт. Актыўнасць юнака адзначылі старэйшыя таварышы-партыйцы, і пасля таго як той пабыў год на пасадзе сакратара камсамольскай ячэйкі, прапанавалі яму стаць... старшынёй Мала-Долецкага сельсавета. А яшчэ праз год 20-гадовы юнак быў накіраваны ў Полацкі акружкам ЛКСМБ. Менавіта тады і пачаўся сур'ёзны творчы шлях будучага класіка беларускай літаратуры; напісаліся першыя вершы пра нянавісць да гнюсных буржуяў, любоў да партыі і роднага краю. Далейшая кар'ера паэта не магла адбыцца без адукацыі, — і Пятро Усцінавіч у 1931 г. заканчвае БДУ. Адгэтуль пачынаецца шлях наверх: пісьменнік выдае адну за адной паэтычныя кнігі (па дзве на год!), працуе адказным сакратаром у газеце «Чырвоная Полаччына», затым, у ваенныя гады, па распараджэнні ЦК КП(б)Б — у партызанскім друку, у 1945—48 гг. — рэдактарам часопіса «Полымя», а з 1948-га аж да 1967 г. — старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. Пятро Усцінавіч быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і БССР, членам ЦК КП(б)Б на XX— XXVI з'ездах Кампартыі Беларусі; сакратаром СП СССР; акадэмікам АН БССР; атрымліваў літаратурныя і дзяржаўныя прэміі; узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, двума іншымі ордэнамі, шматлікімі медалямі.

Вольга КУРТАНІЧ

Слова паэта пайшло да людзей

Сумна і страшна, недарэчна, калі зямное жыццё пакідаюць у росквіце сіл маладыя людзі ды яшчэ ў вясновы час. І шматкрат страшней і жудасней на душы, калі адыходзяць Паэты, сапраўдныя, якім дзяліцца б і дзяліцца з людзьмі Божым дарам. Вось і ў мінулагоднюю вясну пайшоў ад нас Алесь Пісьмянкоў, а ў гэтым годзе ў маі не стала Анатоля Сыса. А следам за ім развітаўся з зямным святлом і цяплом на пяцьдзесят трэцім годзе жыцця Леанід Галубцоў, самабытнага таленту творца, які толькі пачаў набіраць вышыню для палёту.

Пісаць ён пачаў даўно. Помню яго яшчэ па сумесных наведваннях пасяджэнняў у літаб'яднаннях пры газетах "Железнодорожник Беларуси" і "На стройках Минска". Успамінаюцца сумесныя выступленні перад рознымі аўдыторыямі. Якая энергія віравала ў ягонай душы! Яна выпраменьвалася з добрых, вясёлых вачэй, у якіх усё ж можна было прыкмеціць на донцы сум. Пазней і асабліва ў апошні час сум настойліва прабіваўся вонкі. Лёня змагаўся з ім іранічным падтэкстам у вершах, а часам прытупляў вострыя перажыванні непажаданым "лякарствам". Ён аднак збіраў у кулак сваю волю (былы дэсантнік як ніяк), планаваў дасягнуць новых творчых удач, але паціху слабела сэрца — давалі знаць пра сябе праца будаўніка і складаныя душэўныя працэсы. Фінішны адрэзак быў хуткацечны і балючы.

Лёня адчуваў, што піша не горш за іншых, але ці то недахоп часу, ці то ранімасць і сціпласць не дазвалялі ў поўную меру заявіць пра сябе ў літаратуры. І усё ж ёсць дзве паэтычныя кніжкі "До и после" і "Леонидия", а таксама ёсць новые вершы ў Інтэрнеце, ёсць білет Саюза расійскіх пісьменнікаў.

Ён рабіў спробы пісаць на беларускай мове і нават псеўданім прыдумаў — Лявон ЛЯНІВЫ. Адчувалася яго ўнутраная знітаванасць з беларускай зямлёй і асабліва з Магілёўшчынай, дзе нарадзіўся ў вёсцы Хацетава Чавускага раёна. Угаварыў яго падаць заяву і ў наш Саюз беларускіх пісьменнікаў. Аднёс таксама творы ў "Мастацкую літаратуру" для доўгачаканага "Дня паэзіі". І ягоныя вершы там будуць змешчаны.

Позным вечарам на пачатку чэрвеня патэлефанаваў Мікола Шабовіч і паведаміў, што збіраецца секцыя паэзіі, будуць абмяркоўвацца новыя кандыдатуры ў Саюз пісьменнікаў і ў тым ліку Лёня. Я хуценька набраў знаёмы нумар, уяўляючы як абрадую сябра. Трубку падняла Галіна Іванаўна, ягоная жонка, і паведаміла сумным голасам страшную вестку.

Несумненна яго прынялі б у нашу пісьменніцкую арганізацыю і будуць друкавацца ягоныя вершы, але яго ўжо не будзе на гэтай неспакойнай зямлі ў трывожным і супярэчлівым свеце.

Ягоныя кніжкі раздавалі дзеці прысутным на пахаванні. Слова паэта пайшло ў народ, да людзей, пра лёсы якіх ён думаў.

Все чаще навещают боли,
Бывает — в сердце сильно колет.
Оно не выдержит когда-то
И разорвется, как граната.
Одно желаю — чтоб в тот миг
Не покалечило других.

Дзякуй, Лёня, што ты быў, што ты тварыў, што перажываў за іншых, не шкадуючы сябе. Дай табе Бог шчасця ў іншым, невядомым нам вымярэнні і доўгага жыцця тваім вершам!

Янусь МАЛЕЦ

Паэт і час

«Пятрусь Броўка — таленавіты паэт, творчая індывідуальнасць якога складвалася пад уплывам паслякастрычніцкага часу. Ён — сын складанай эпохі, што ўвабрала ў сябе стваральныя і разбуральныя пачаткі, вучыла верыць у нерэальнае, утапічнае, а затым — расчароўвацца ў ім».
М.Мішчанчук.

«Не буду я стаяць на раздарожжы, // Вачамі сумнымі глядзець удалячынь», — дзёрзка і ўпэўнена заявіў малады паэт Пятрусь Броўка ў 1926 годзе. Уласцівыя яму юнацкі максімалізм, узнёсласць і апантанасць былі характэрнымі рысамі 20-30-х гг. — часу вялікага супрацьстаяння старога і новага свету, занядбання ідэйна-мастацкіх традыцый, здабытых у папярэднія гады, нараджэння літаратуры сацыялістычнага рэалізму з абавязковым услаўленнем заваёў «самага перадавога і адзіна правільнага ва ўсім свеце сацыялістычнага ладу жыцця». Кожная эпоха выбірае сабе адпаведную форму выяўлення. Таму заканамерна, што першыя зборнікі паэта «Гады, як шторм», «Прамова фактамі» (1930), «Цэхавыя будні» (1931) змяшчаюць схематычныя, публіцыстычна-ілюстрацыйныя творы, дзе асноўнымі з'яўляюцца матывы радасных працоўных будняў, вобразы шчаслівай Радзімы і шчаслівага народа, жыццё якога «расквітнела» пад «сонцам сталінскіх пяцігодак». Аднак галоўная вартасць тагачаснай і ўвогуле ўсёй паэзіі П.Броўкі — шчырасць пачуццяў і выказаных думак, бо ён заўсёды глыбока верыў у тое, пра што пісаў. Дарэчы, значна пазней — у 70-я гг., падчас пераасэнсавання ўласнага жыцця, пройдзенай «штармавой» пары маладосці Пятрусь Броўка прысвяціў шэраг апавяданняў, якія склалі зборнік «Разам з камісарам» (1974).

Сталеў час, а разам з ім паэт. Юнацкі максімалізм і павярхоўнасць паступова змяняліся ўдумлівасцю, імкненнем спасцігаць унутраную сутнасць з'яў і падзей (вершаваныя зборнікі «Прыход героя» (1935), «Вясна радзімы» (1937), «Шляхамі баравымі» (1940)). Гераічны і трагічны перыяд Вялікай Айчыннай вайны надаў лірыцы Броўкі магутнасць патрыятычнага пачуцця, эпічнасць, гуманістычны пафас і філасофскі падтэкст. Найбольш вядомымі ў гэты час сталі вершы-балады «Байцам-беларусам», «Магіла байца», «Надзя-Надзейка» (1943), паэмы «Беларусь» (1943), «Ясны кут» (1944), «Паланянка» (1945).

«Я за жыццё схапіўся прагна,// Як за галлё// Дубовы ліст...», — гэта ўжо 1956 год. Паэт сапраўды адчуваў і перадаваў паўнакроўнасць жыцця, прагна лавіў яго шчаслівыя хвіліны, шчыра перажываў у гадзіны смутку і трывогі, задумваўся над агульначалавечымі пытаннямі і праблемамі эпохі. З 1952 года па 1956 год ішла праца над раманам «Калі зліваюцца рэкі», адзін за адным з'яўляліся паэтычныя зборнікі «Пахне чабор» (1959), якому даў назву знакаміты аднайменны верш, «Далёка ад дому» (1960), «Высокія хвалі» (1962), «Між чырвоных рабін» (1969), «Калі ласка» (1972), «І ўдзень і ўночы...» (1974), «Што сэрца праспявала» (1979), паэмы «Голас сэрца» (1969) — надзвычай моцны па сіле лірычнага і філасофскага пачуцця твор, прысвечаны загінуўшай у Асвенціме маці, «Кірыл Пракаповіч» (1964), «Дума аб бессмяротнасці» (1970), «Марат Казей» (1976) і інш.

«Я не скажу ніколі: — Годзе!..// Бо век і так не доўгі мой, — // Маё Дваццатае Стагоддзе — // Усё пражытае з Табой!», — такімі былі словы паэта на схіле жыцця. І на самай справе паэзія Петруся Броўкі, здаецца, больш чым творчасць каго іншага адлюстроўвае эпоху з яе мастацкім стылем і грамадскімі праблемамі.

«Ахвяра утапічных ідэалаў, пясняр Леніна і партыі, П.Броўка, аднак, не растварыўся як мастак у часовым, кан'юнктурным, здолеў напісаць і вечна жывыя творы — пра барацьбу Святла і Змроку, Дабра і Нянавісці, пра закатаваных фашыстамі людзей і сваю маці. Ён доўга будзе вядомы менавіта падобнымі творамі, дзе няма асаблівага месца палітыцы, дзе ўсё пранікнута ідэяй Дабрыні». **М.Мішчанчук.**

Наталля ЯКАВЕНКА

ЛеГалізацыя

Сяргей ПАЛУЯН:

"Прыбліжаць святлейшыя дні для народа мусіць кожны з нас. Няма пякнейшага назначэння, як набліжэнне праўды і святла. Гэта святая павіннасць."



Лідзія АРАБЕЙ. *"Пошукі ісціны"* (абразкі. Мінск, выдавец Віктар Хурсік, 2005, у аўтарскім арыгінале, 250 асоб., 220 стар.)

У Лідзіі Львоўны напрыканцы чэрвеня пашанотны юбілей. І гэтая новая яе, свежая кніжка, як чарнавы нататнік сучаснага жыцця, якраз паспела да гэтай самай урачыстасці. Праўда, хто сёння, апроч родных, сяброў і знаёмых, можа павіншаваць беларускага пісьменніка, нават самага заслужанага?.. Хіба толькі яго чытач. Няхай і ўскосна і не прылюдна, а проста чытаючы, скажам, такі абразок — *"Голас народа — голас Божы... Хто прыдумаў такое выслоўе, хлуслівае ад пачатку да канца? Хто, калі не народ, вызваліў ад расправы злодзея Вараву і паслаў на крыж Хрыста? Крычалі ж на ўсю моц — "Распні яго!" А з якім захапленнем глядзеў той народ, як інквізіцыя паліла на вогнішчах ерэтыкоў! І зусім нядаўна хто, як не народ, крычаў: "Смерць ворагам народа!" І пад кулі ішлі самыя лепшыя, самыя чыстыя.*

Скажаце, то быў не народ, а натоўп? А натоўп адкуль бярэцца?" — наморшчыць лоб, прыжмурыўшы вочы, ды сам сабе кіўне галавою. І гэты нікому нябачны ківок, як знак згоды і ўдзячнасці і будзе найлепшым ушанаваннем жыцця і творчых намаганняў гэтаму пісьменніку.

Скажу шчыра, яшчэ да нядаўняга часу я не быў асаблівым прыхільнікам празаічнага таленту Л.Арабей, але гэтая кніжка змусіла мяне глянуць на яе творчасць "іншымі вачыма". Сваімі, вядома, уласнымі, але з іншага пункту погляду... Аголеная шчырасць, і непрыхарошаная лаканічнасць пісьма, і пакінутыя чытачам дарэшты "неразжаванымі" падтэксты лепшых яе абразкоў, гавораць пра адметны літаратурны вопыт, які ў сукупнасці з талентам і выяўляюць заўважны плён. Прастата стылю таксама не стамляе (а як стомішся, калі разпораз натыкаешся на такое: *"Са сталіцы ў родную вёску прыехаў пісьменнік, выступаў перад землякамі. Адна бабулька са скрухаю прамовіла: "Які ты, Сашка, быў, такі і застаўся. Па-гарадскому нават гаварыць не навучыўся." А вы кажаце — нацыянальная ідэя..."*) і ў той жа час назовы, нададзеныя нават самым лаканічным абразкам, не стамляюць чытацкую ўвагу, як магло б адразу падацца. Звычайныя зорачкі, што найчасцей бывае ў падобных выпадках, выглядалі б тут надакучлівымі, як летнія мухі... Па-добраму ўражвае, што пражыўшы доўгае чалавечае жыццё, пісьменніца захавала беззаганнасць душы і светлы розум. Безумоўна, не ўсё роўна ў гэтай кніжцы з мастацкага і эстэтычнага боку гледжання, але ўсё цікава з грамадска-жыццёвай пазіцыі сучаснага чалавека...

Вось абразок "Зубы": *"Мае сяброўкі, хоць і не вельмі яшчэ старыя, а бяззубыя. Яны не маюць грошай уставіць зубы"*. І ўсё — кропка. Голы факт — не мастацкі акт. Аднак асобна трэба адзначыць сумленнасць і нясхібнасць грамадзянскай пазіцыі самой Л.Арабей. Цяпер многія літаратары пра чысціню сваёй асобы мала дбаюць. Пішуць, каб жыць, але не жывуць, каб пісаць... Ну і балючае пытанне нашай нацыянальнай самасці, вядома, не абыходзіць увагі вядомай пісьменніцы. І гэты боль *выразна* адчувальны чытачом, паколькі энергетыка яго акумулюецца праз бесперастанную (жыццядзейную) аўтарскую падзарадку. Хоць, вядома, не так лёгка дзяліцца тым, што і ў самога на сыходзе, але, калі ты творца, калі гэта твой адзіна вызначаны вырак, тваё прызванне, то ўхіленне ад наканаванага табе, калі такое ўвогуле магчыма, прыводзіць да поўнага энергетычнага спусташэння. Усе абразкі Л.Арабей не датаваныя, але характар нашага часу і беларускага менталітэту выяўлены ў іх даволі пэўна і пазнавальна. Уласна перажытае, убачанае, пачутае, прачытанае, прааналізаванае — усё гэта ёсць мастацкай *закваскай*, дражджамі літаратурнай творчасці вядомай пісьменніцы. І дай ёй Божа здароўя ды такога ж натхнення і надалей. Бо, цытуючы яе абразок "Бог і пяро": *"Чытаеш старонку за старонкай розных аўтараў. І тут, і там словы, сказы, і напісана пісьменна, і нібыта думка ёсць і тут і там. Але што за таямніца, што за магія відаць яскрава — тут рамяство, а там талент, тут з галавы, а там ад Бога. А Богам называем мы непазнаныя сілы, што кіруюць пяром. І напісанае тым пяром, якім кіруе Бог — хвалюе, а напісанае без Бога пакідае абыякавым"*, міжволі хочацца мне дадаць і наступны абразок Лідзіі Львоўны ("Пахвала"), каб пазбегнуць магчымага непаразумення пасля гэтай публікацыі: *"Адзін пісьменнік падарыў мне сваю кніжку. Не вельмі спадабаліся мне яго творы, але пры сустрэчы, каб не пакрыўдзіць — пахваліла. Цяпер, калі хто пахваліць напісанае мною, я думаю: гэта ён з далікатнасці"*. Няўжо і я апынуся ў гэтым шэрагу?..

Наталля КУЧМЕЛЬ. *"Імгненні"* (вершы, серыя "Дэбют"; "Мастацкая літаратура", Мінск, 2005, рэдактар В.Шнай, 1000 экз., 62 стар.)

Кніжка паэзіі Н.Кучмель чакалася так доўга, што, калі нарэшце з'явілася, цяжка было паверыць у яе рэальнасць, настолькі была яна сціслай і сцішанай, нераўнуючы як склаўшы натомленыя крылы матыль на сонечным падаконні... альбо намаляваны на яе тытульнай вокладцы мастаком-афарміцелем А.Царовым дзьмухавец у руках дзяўчынкі...

Таму і чытаць яе трэба асцярожна, на затрыманым дыханні, каб не здзьмуць адпрыродна сціснаныя словы, радкі, строфы, як той дзьмухаўцовы пух...

Ноч пяе дыханнем тваім.
Я яго чую — і ноч пяе.
Ноч пяе золатам кончыкаў вей.
Я іх бачу — і ноч пяе.
Ноч пяе дакрананнем рукі,
Далонню ў далоні, крокам у крок.
Паветра згушчаецца — не ўдыхнуць,
І з сэрца капае цёплы сок.

Н.Кучмель вельмі тонкі мастак-псіхолаг, які вычувае ўсякую змену і любы зрух унутраных чалавечых пачуццяў. Часцей за ўсё паэты пішуць вершы пра тое, што самі бачаць і чуюць альбо пра тое, што бачаць і чуюць іншыя ці ўрэшце, як постмадэрністы, даюць уласную інтэрпрэтацыю ўжо некім бачанага і чутага...

Дар інтуіцыі — адзін з галоўных складнікаў паэтычнага таленту. Не майстэрства, а менавіта таленту, бо інтуіцыі не навучышся і не навучаць. Вершы Н.Кучмель нечым нагадваюць начнікі (настольныя лямпы альбо таршэры). Мы ўключаем-запальваем іх сярод ночы толькі ў скрайніх выпадках: з прычыны хваробы, дурнога сну, спалоху, тэлефоннага ці дзвярнога званка, бяссоніцы... Успышка святла вяртае нас у свет рэальных рэчаў, адваёўваючы іх у беспрасветнай цемры... І вось на той мяжы (святла і цемры) выкрасаецца тая іскра, з ракурсам новага светабачання (гэта можа быць і творчы акт, і навуковае адкрыццё, і іншае духоўнае і разумовае азарэнне). І тады вершы — больш чым **словы**.

Такая ноч, што салаўі — крычаць
Адзін адному праз глухую цьму.
Такая ноч, што хочацца сказаць:
"Жыццё маё" — усё адно каму.
Спыніся міг! Хай у табе ізноў
Склубіцца час, мінуласць, успамін —
Каб зноў глушылі крыкі салаўёў
І ў цёплай цемрадзі цялесна млеў язмін.

Н.Кучмель не растранжырыла сваёй душы на пустое-часовае, адвеяўшы на жыццёвай дарозе наноснае і своекарыслівае. У яе не сустрэнеш *сталапісных* а тым больш мусовых рыфмаванак, якія ў часе прафесійнай інерцыі шмат каму з сучасных беларускіх паэтаў здаюцца, *"ну, калі не сапраўднай паэзіяй, то проста добрымі вершамі"*.

Сапраўдны паэт пазнаецца (прынамсі мною) па трох прыкметах: *па немагчымасці растлумачыць ім напісанае, па ўпэўненасці ў неабходнасці напісанага, па спакойным стаўленні да лёсу напісанага...* Усе вышэй згаданыя прыкметы характэрныя для Н.Кучмель. Скажам, як патлумачыць гэтую яе "Песню" (дарэчы, запісаную ў празаічнай форме)?

Каханы мой вячэраў у доме маім,
у сціплым і бедным пакоі; і не зайздросціла я
гаспадыні маёй у пышных яе палацах.
Валасы твае пахнуць ветрам, цела тваё
пахне хлебам, семя тваё пахне горкай травой
палявой.
Сонца ўзыходзіць — залоціць шаты
соснаў ды кіпарысаў; сонца сыходзіць — ты
са мной застаешся.
Валасы твае пахнуць ветрам, цела тваё
пахне хлебам, семя тваё пахне горкай травой
палявой.

Паэзія словамі не тлумачыцца, але ж ёсць душэўнае запатрабаванне ў ёй і пры гэтым не ўзнікае аніякага хвалявання за яе крытычную ацэнку. Так бывае толькі з сапраўдным.

Ужо не першы раз *паказваючы* чытачам на талент Н.Кучмель і сёння цверджу тое самае: зазірніце ў яе першую, сталую і таленавітую кніжку паэзіі і вы спазнаеце — не на маіх, а ўжо на яе словах — вычуванне прыгожага і высокага мастацтва. Зрэшты, паэтка яшчэ спадзяецца на новыя адкрыцці і празарэнні:

Не кідай, будзь са мной,
жыві, пачуцце-нежыць:
Хацець — што не маё,
кахаць — што не належыць...

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2005 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 22800 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 10800 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 3800 руб.
на 4 месяцы — 7600 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 4800 руб.
на 4 месяцы — 9600 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 4000 руб.
на 6 месяцаў — 12000 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс —749682)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ (в. а. намесніка галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Ірына ШАЎЛЯКОВА
Наталля ЯКАВЕНКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый. Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 2993
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 22.06.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 733

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12